# НАША НІВА

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у панядзелкі. №28 (149) 25 КАСТРЫЧНІКА 1999г.


## 12 дзяцей атруцілі хлёркаю

На пачатку месяца ў менскім Палацы воднага спорту адбылося драматычнае здарэньне. Нечакана ўзровень утрыманьня хлёркі ў памяшканьні перавысіў норму, у выніку чаго 12 дзяцей трапілі ў шпіталь з атручаньнем.

4-га кастрычніка пасьля 4-х гадзінаў у паветры над тэрыторыяй басэйнаў зьявілася хлёрнае воблака. У вадзе, сьцьвярджае дырэктар басэйну Сяргей Рапінчук, на гэты момант утрыманьне хлёру было ў норме, значыць, хлёр не з вады выпарыўся, а трапіў у басэйн іншым чынам.

Як толькі гэтае воблака заўважылі, усіх з басэйну вывелі, 40 чалавек абсьледавалі, 12 дзяцей прыйшлося адправіць у шпіталі, 5 зь іх пацярпелі моцна, а двое дык і добра атруціліся.

На наступны дзень інстанцыі склікалі камісію, каб расьсьледавала прычыны. Дасюль ніякіх высноваў ад гэтай камісіі няма. Ніхто з МУС, пракуратуры, штабу грамадзянскай абароны ня выехаў тэрмінова на месца здарэньня, а зрабілі тое толькі на наступны дзень.

Дырэктар Рапінчук кажа, што за ноч уся хлёрка з паветра асела ў ваду, і толькі гэта ўжо ўзьняло яе канцэнтрацыю ў вадзе (на наступны дзень камісія выявіла перавышэньне ўтрыманьня хлёркі ў вадзе ў 3 разы), а, маўляў, замеры яшчэ за пяць хвілінаў да здарэньня паказвалі, што ўсё ў норме. Дырэктар адкідвае абвінавачаньні ў парушэньні дазіроўкі і вылучае дзьве вэрсіі.

Магчыма, што з прычыны састарэласьці абсталяваньня атрымалася запаветрываньне фільтру, і раствор хлёру пайшоў не ў ваду, а ў паветра.

Магчыма, нехта падстроіў: «Абстаноўка ў Палацы цяжкая, — кажа дырэктар. — Цякучка кадраў 300%».

Рапінчук канфліктуе з генэральным дырэктарам комплексу «Алімпійскі», у склад якога ўваходзіць водна-спартовы комплекс Макейчыка, і не выключае магчымасьці «дывэрсіі» супраць сябе. Тут зьмянілася 5 намесьнікаў дырэктара па эксплюатацыі, тых, хто адказвае за падобныя выпадкі.

Трэба адзначыць, што менавіта ў Палацы воднага спорту, — у спорткомплексе «Алімпійскім», створаным у сакавіку 98-га распараджэньнем Лукашэнкі, арганізавана трэніраваліся баевікі РНЕ (Расейскага Нацыянальнага Адзінства).

**Аляксей Шыдлоўскі**



*Мікола Статкевіч, лідэр Сацыял-дэмакратычнай Грамады, ужо тыдзень трымае галадоўку ў турме*

## "Нас нельга назваць героямі, мы выразьнікі настрою ў грамадзтве"

*На пытаньне "Ці ня каецеся вы за свае дзеяньні 17 кастрычніка?" адказваюць "байцы зь перадавой", то бок тыя, хто кідаў каменьне ў міліцыянтаў. Зь вядомых прычынаў усе імёны і прозьвішчы зьмененыя, акрамя аднаго, на жаданьне самога рэспандэнта.*

**Ярык з-над Менску:**

Мы пачалі кідаць камяні ў міліцыянтаў, таму што гэта было адзінай магчымасьцю адпомсьціць ім за тое, што яны пачалі нападаць на людзей, якія ўжо адыходзілі. Пагрозы для міліцыянтаў аніякай не было. Калі б, напрыклад, яны нікога не чапалі, дык тады можна было б абвінавачваць моладзь і казаць пра тое, што гэта былі нават больш чым нецывілізаваныя сродкі выказваньня свайго пратэсту, бо ўсё ж такі, людзі былі параненыя. Самымі агіднымі былі тыя міліцыянты, што выбягалі за некалькі дзясяткаў мэтраў ад кардону, каб, гасячы нас, пагасіць нейкія свае амбіцыі, спатоліць прагу да гвалту.

*Працяг на старонцы 6.*

Фота IREX-ProMedia.

## Урокі гвалту

### Падзеі 17 кастрычніка вачыма сьведкаў

*Галоўны зь іх — той, што ў гвалту не бывае ўрокаў. У гвалту не бывае ідэі і ня можа быць сьцьвярджальнага выніку. Адно падбітае вока, сінякі ды крыху больш дзікага інстынкту, крыху менш разважнае думкі. Сёньня ў «Нашай Ніве» падзеі 17 кастрычніка вачыма сьведкаў.*

*На старонках 6—7.*

## Якою прачнецца Ўкраіна 32 кастрычніка пасьля выбараў?

*31 кастрычніка ўва Ўкраіне адбудуцца прэзыдэнцкія выбары. Беларусь уважліва сочыць за імі. Там жывуць нашы сябры, нашы стратэгічныя партнэры. Сёньня сваімі прагнозамі й назіраньнямі дзеляцца нашы кіеўскія сябры: палітоляг і крытык, доктар фізыка-матэматычных навук Максім Стрыха і рэдактар альманаху «Філософські студії», журналіст украінскай службы радыё «Свабода» Віталь Панамароў.*

Гэтую прэзыдэнцкую кампанію ва Ўкраіне па эўрапейскіх стандартах нельга назваць сумленнай ды адкрытай. Безумоўна, у шмат якіх краінах СНГ паняцьце аб дэмаркатычных працэдурах яшчэ больш эфэмэрнае, а панаваньне якогась «бацькі» і «туркмэнбашы» — шчэ больш аўтарытарнае. Аднак, нават што да Расеі, Украіна яўна прайграла. Бо барацьба алігархаў у Маскве, прынамсі, робіць магчымым выказваньне розных гледзішчаў на нацыянальных тэлеканалах. Ва Ўкраіне, з-за ейнай спэцыфікі, усе «моцныя людзі» дзяржавы арыентуюцца на цяперашняга прэзыдэнта. І таму нічога падобнага на маскоўскую перадвыбарчую барацьбу зь ейнымі дэбатамі, палемікаю ды сэнсацыйнымі адкрыцьцямі ня выйшла.

Адкрыцьці, праўда, былі. Парлямэнцкая сьледчая камісія на чале з Г.Амельчанкам публічна агалосіла факты страшэнных фінансавых махінацыяў ды злоўжываньняў народнага дэпутата А.Воўкава, колішняга загадчыка гароднінай базы, які сёньня зьяўляецца адным з найуплывовых палітыкаў Украіны і ачольвае адзін з трох выбарчых штабоў Л.Кучмы. Чаго вартыя ўжо толькі дыямэнтавыя каралі коштам у 400 тысячаў даляраў, прыдбаныя А.Воўкавым у Бэльгіі ў якасьці сьціплага падарунку дачцэ Л.Кучмы... Але ні гэтыя, ні іншыя прыкрыя для прэзыдэнта рэчы не маглі прагучаць ні па адным з трох нацыянальных тэлеканалаў. А накладаў апазыцыйных уладзе газэтаў яўна замала. З прычыны нізкага жыцьцёвага ўзроўню большасьці насельніцтва ды страшэнна дарагой паліграфіі толькі два апазыцыйныя выданьні — «Сільскі вісті» і парлямэнцкі «Голос Украіны» — маюць наклад па-над 100 000 асобнікаў. І ў гэтым іх поўнасьцю перакрывае танны прапрэзыдэнцкі таблёід «Факти» з накладам больш мільёну.

Яўнай правакацыяй выглядаў і замах на Н.Вітрэнку. Выкарыстаньне гранатаў РГД сьведчыць: лідэра «прагрэсыўных сацыялістаў» ніхто й ня думаў прыбіраць. Трэ было толькі троху крыві, каб дыскрэдытаваць аднаго з галоўных канкурэнтаў Л. Кучмы — А.Марозa, на мясцовы выбарчы штаб якога сьпісалі ўсю адказнасьць за няўдалы тэракт.

У такіх умовах уладам магла б эфэктыўна процістаяць толькі шчыльна згуртаваная апазыцыя. Аднак згуртаванасьці дэмакратам, як заўжды, бракавала.

Выбарчую кампанію Л.Кучмы кансультуюць групы расейскіх іміджмэйкераў, якія адразу ж вырашылі перанесьці ва Ўкраіну мадэль расейскіх выбараў 1996 году. І каб гарантаваць перамогу Л.Кучмы, улады сёньня робяць усё, каб вывесьці ў другі тур шэрага лідэра ўкраінскіх камуністаў П.Сіманенку.

*Працяг на старонцы 5.*

## Расколаты рух

На тле войнаў і катастрофаў, якія цяпер зь небывалай інтэнсыўнасьцю грымяць па ўсім сьвеце, наша Беларусь зусім не выглядае ціхай затокай. Над краінаю і грамадзтвам нібы завіс фатальны знак расколу. У Беларусі цяпер колецца ўсё, нават тое, што быццам бы аб'ядноўваецца і зьбіраецца за стол перамоваў. Расколы прыносяць дзе плён, а дзе страты. Не заўсёды адназначна можна сказаць, што плён, а што страта. Тым ня менш, расколы — гэта ўсё ж не застой, а рух, зьмены, жыцьцё. Якое ні ёсьць...

*Артыкул Сяргея Паўлоўскага — на старонцы 3.*

**Апісаньне жыцьця й зьнішчэньня бажніцы Апекі Маці Божае ў Воршы.** Разбуралі яе 30 гадоў таму, у 1969 годзе.

*Пра гэтую трагедыю піша мастак Мікола Купава.*

*На старонцы 8.*

Фота з архіву Міколы Купавы

весткі зь Літвы

## Вучыце мовы

Наступным ляўрэатам літаратурнай Нобэлеўскай прэміі можа стаць літовец. Два сябры, два паэты, мэксыканец Герарда Бэльтран і амэрыканец Керы Кіс паедуць сёлета пажыць на швэдзкую выспу Готлянд, дзе будуць перакладаць літоўскіх паэтаў Сігітаса Гяду й Карнэліюса Плацяліса. Пераклады на гішпанскую мову будуць пасьля выдадзеныя ў Гішпаніі й Мэксыцы. Керы Кіс, які сам ужо пераехаў жыць у Вільню, перакладае літоўскую паэзію даўно. Ён кажа: «Ніхто з амэрыканскіх паэтаў не атрымаў Нобэлеўскае прэміі. Зараз пры садзеяньні двух студэнтаў-літоўцаў я перакладаю вершы Сігітаса Гяды й лічу іх вартымі гэткай прэміі. Падкрэсьліваю — уся справа ў перакладзе». Вось у чым справа!

Амэрыканскі паэт, цяперашні віленчук, кажа таксама, што «зь літоўскае паэзіі старэйшага пакаленьня лепшы — Карнеліюс Плацяліс...» Спадар Плацяліс быў, дарэчы, першым зь літоўцаў, хто падпісаў ліст у абарону Славаміра Адамовіча, калі той сядзеў у турме. Калі ўся справа ў перакладах, дык можа хай сабе спачатку літоўцы атрымаюць Нобэля, а потым ужо мы... Не пакідайце ж і мовы чужыя!

## Пераканалі

Прыяжджаў у Менск напачатку гэтага месяца віцэ-міністар замежных справаў Літвы спадар Ушацкіс. Яго пераконвала лукашэнкаўскае чынавенства на ўсе лады, што ў Беларусі ўсё добра й можна сябраваць і надалей. Маўляў, дэмакратыя. А што да Шарэцкага й апазыцыі, дык гэта ўсё дробязь. Літоўскі міністар сабе і паехаў. Ажно ў Вільні яму паведамілі, што падчас «Маршу Свабоды» была затрыманая літоўская журналістка з тэлеканалу LNK Ірма Янаўскайтэ. Яна спрабавала здымаць беларускіх міліцыянтаў, за што й адседзела ў пастарунку да канца акцыі. І стужкі паадбіралі.

«Спрачацца там ня мае ніякага сэнсу, бо добра ведама: людзей ў Беларусі затрымліваюць на 72 гадзіны і без усялякае прычыны», — распавяла пасьля ўжо дома І.Янаўскайтэ.

Вось і атрымаўся першым вынікам першага візыту літоўскага віцэ-міністра ў Менск — афіцыйны пратэст. Яго днямі атрымаў пасол Беларусі ў Вільні сп. Гаркун. Сам сп. Ушацкас, разводзячы рукамі, нічога не камэнтуе. Літва нарэшце пераканалася...

**Ліцьвін**

## Саюз голаду і холаду

На мінулым тыдні (18—24 кастрычніка) у Пінску ўрэшце пачалі даваць у кватэры цяпло. Аднак увогуле на Піншчыне нарыхтавалі толькі 20% ад неабходнай колькасьці мазуты. На Століншчыне назапашана 600 тонаў мазуты, прытым, што да канца бягучага году неабходна мець каля 4000 тон. Хутчэй за ўсё, узімку жыхары Століна і Столінскага раёну гарачай вадой забясьпечвацца ня будуць. Амаль тое самае ў Лунінцы, Янове, Драгічыне.

Бракуе таксама звадкаванага газу. У хаты, дзе ёсьць грубкі і дровы, газ увогуле не завозіцца — лічыцца, што там ежу можна прыгатаваць бяз газу. Пінск атрымлівае толькі трэцюю частку ад неабходнай колькасьці балёнаў. З-за абмежаваньня паставак блакітнага паліва ў гарадах рэгіёну стварыліся вялізныя чэргі. Больш за паўтысячы чалавек чакаюць газу ў Янове, а ў Баранавіцкім раёне чарга дасягнула 3 тысячаў. На аўтазапраўках распараджэньнем аблвыканкаму ўстаноўленыя нормы продажу бэнзіну і дызэльнага паліва.

Начальнікі ўсіх узроўняў аднадушна тлумачаць дэфіцыты недапастаўкамі альбо падвышэньнем цэнаў на энэрганосьбіты з боку Расеі. У той жа час гэтыя ж начальнікі пераконваюць палешукоў у неабходнасьці як мага хутчэй падпісаць саюзную дамову. Круцялі.

**Зь Пінску — Аляксей Дзікавіцкі**

навіны за суботу і нядзелю

## Біскуп Блін

Учора стала вядома, што пробашча магілёўскага касьцёла Сьв.Станіслава Ўладыслава Бліна папа Ян Павал II узьвёў у біскупы. Ён стане біскупам Віцебскім, шостым біскупам у Беларусі.

## Мірон ня сьпіць

22 кастрычніка ў Віцебску на плошчы Перамогі вывесілі бел-чырвона-белы сьцяг на дроце электраперадачы акурат насярэдзіне плошчы насупроць помніка воінам-вызвольнікам. Зьняць яго ўлады не наважваліся два дні. Былы палітвязень Уладзімер Плешчанка кажа, што аўтар гэтага ўчынку — Мірон, які, па ягоных словах, зьяўляецца сябрам віцебскай Рады КХП-БНФ.

**Зь Віцебску — Юрась Карпаў**

## Наш дом — Ізраіль

На запрашэньне дэпутатаў ізраільскага кнэсэту (гэта іхны Вярхоўны Савет) ад партыі былых савецкіх габрэяў, якая называецца «Наш Дом — Ізраіль» дэлегацыя лукашэнкаўскіх дэпутатаў на чале з Канаплёвым паляцела ўчора ў Ерусалім. БелаПАН піша, што гэтыя 5 дэпутатаў будуць там гуляць цэлы тыдзень, аж да 31 кастрычніка.

## Мост у Гомелі

У Гомелі ў пятніцу адкрылі новы вялікі мост на дарозе ў Менск і Магілёў. У наступным годзе тут абяцаюць дабудаваць Лядовы палац і Палац творчасьці моладзі, піша БелаПАН.

# ПРЫЙДУЦЬ ДЗЯДЫ

Старадаўнія Дзяды набылі для нас яшчэ адно, найноўшае значэньне. На Дзяды ў 1987 годзе пад помнікам Янку Купалу ў Менску, адбыўся адзін зь першых незалежніцкіх мітынгаў. А праз год на Дзяды выйшлі тысячы людзей, якія жалобнымі калёнамі пайшлі да Курапатаў. Тады яшчэ не насілі сьцягоў. Тады несьлі багата кветак. Шмат хто папросту йшоў на могілкі да сваіх блізкіх. 30 кастрычніка 1988 году каля Маскоўскіх могілак людзей, якія зьбіраліся правесьці мітынг-рэквіем жорстка зьбілі. Не было яшчэ амону. Але хапіла савецкіх міліцыянтаў. Быў сьлезацечны газ, дубінкі й шмат, шмат машынаў невядомага тады прызначэньня. Дзень жалобы па тых, хто стаў ахвярамі бальшавізму, стаў днём першае ахвяры беларусаў дзеля сваёй Свабоды. Дзень памяці продкаў застаўся ў памяці менавіта гэтак...

Дзяды сталіся абавязковай палітычнай акцыяй. І, па традыцыі, нічога добрага ад уладаў у гэты дзень не чакаюць. Атрымліваецца, што міжволі беларусы самі падтрымліваюць сцэнар тае драмы 1988 году. «На Дзяды сустрэнемся», — кажуць адзін аднаму беларускія патрыёты. А калі ж сустракацца зь Дзядамі?

Вядома, на Дзяды.

Як прыйдзе той дзень, за багатым сталом зьбярэмся сем'ямі. Добра, калі ў дзедавай хаце. Сустрэнемся з душамі Дзядоў, якія па чарзе, па каленях роду, зьлятуцца за стол. Мы будзем згадваць іх, мы згадаем, кім былі яны, мы будзем разумецца зь імі на іхнай мове...

Пра гэты дзень гаварылася нячаста. Яшчэ радзей савецкія беларусы згадвалі ягоны сэнс. Але абавязкова праваслаўныя, у апошнюю суботу кастрычніка, перад Зьмітровым днём, а каталікі ў апошнюю нядзелю, перад Днём Задушных, ладзілі па хатах сьвяточныя сталы. Страваў мусіла быць ня менеў, як сем, а то й болей, аднак абаязкова іхная колькасьць была няцотнаю. І стаяў на стале лішні посуд. Для Дзядоў. Тыя, хто й пра гэта ня памятае, начыста прыбіраў хаты. І перад Дзядамі абавязкова мыюцца шыбы, апошні раз перад марознаю зімою. Гэтага ніхто забараніць ня можа.

**С.Х.**

## Улады імкнуцца сарваць «Дзяды»

У Менскі гарвыканкам былі пададзеныя дзьве заяўкі «Дзяды 99». Першая — ад Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі БНФ, якую прадстаўлялі Алесь Чахольскі і Сяргей Папкоў. Яны настойвалі, каб улады дазволілі шэсьце ад Акадэміі Навук да Курапатаў і жалобны мітынг у нядзелю 31 кастрычніка.

Другая заяўка была ад руху і партыі БНФ «Адраджэньне», толькі ў ёй просіўся дазвол на шэсьце ад плошчы Якуба Коласа.

Менгарвыканкам адхіліў абедзьве заявы, матывуючы гэткае рашэньне падзеямі 17 кастрычніка. Мітынг жа ў Курапатах — гэта кампэтэнцыя Менскага аблвыканкаму, і рашэньне па ім яшчэ не прынятае.

Гэткім чынам, лёс акцыі дагэтуль ня вызначаны. Але ўжо пэўна ведама, што ў нядзелю 31 кастрычніка ў Курапатах зьбяруцца людзі. Сачыце за абвесткамі ў незалежнай прэсе й на вуліцах.

**Аляксей Шыдлоўскі**

навіны з Падняпроўя

## Піць таньней, чым есьці

Віна на Магілёўшчыне сёлета сталі набываць аж на 30% больш, чым летась, малака і піва — на 20% больш. Затое на 18—25% менш прадалі кілбасаў і цукру, а рыбы — удвая менш.

## Ёсьць яшчэ сіла

Сома-волата ў 1,5 мэтры вылавілі рыбакі з Бабруйску ў Чыгірынскім вадасховішчы. Важыла рыбіна 25 кг.

## Перамога праваабаронцаў

Малую, але перамогу адзначаюць магілёўскія дэмакраты. Праваабаронцу Валадара Цурпанава затрымалі 17 кастрычніка пасля Мітынгу Свабоды, санкцыянаванага гарвыканкамам. Ідучы зь мітынгу, Валадар нёс плякат «Не палітычным рэпрэсіям!». Ён прайшоў так 2 кілямэтры вуліцамі, а тады яго затрымалі міліцыянты на чале з намесьнікам начальніка Цэнтральнага РАУС маёрам Чумаковым і абвінавацілі ў правядзеньні шэсьця з плякатам. Але судзьдзя Ганна Тулянкова апраўдала яго, бо ў законе шэсьцем кваліфікуюць «дзеяньні групы асобаў». Міліцыянты так і не дабіліся растлумачыць судзьдзі, дзе там была група, калі йшоў адзін чалавек.

**Сымон Глазштэйн**

**Prosim adhuknucca ūsich tych, chto maje zacikaŭlenaść u supolnaje pracy pa stvareńni lićvinskaha kulturnaha kantekstu** (raspracoūcy lićvinskaje histaryjahrafii, udaskanaleńni nacyjanalnaje piśmovaści, movy, adradžeńni lićvinskaha hramadzkaha žyćcia i h.d.), a taksama dla abjadnańnia ū ahulnych karparatyūnych intaresach.

Tel.: (017)214-2039; pager: (017)278-1101 ab.6663; E-mail: litvania@mail.ru albo litvania@europemail.com;
naš sajt: http://come.again.to/ LITVANIA

**«МЕЧ У КАМЯНІ», «БАЛТО»,«АЛІСА Ў КРАІНЕ ЦУДАЎ», «ПРЫГАЖУНЯ Ў СОННЫМ ЛЕСЕ»** — мультыплікацыйныя фільмы, дубляваныя па-беларуску акторамі вядучых менскіх тэатраў. **«ЕХАЎ КАЗАЧНІК БАЙ», «ЦІК-ТАК ХОДЗІКІ», «БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ», «СТОЙКІ АЛАВЯННЫ САЛДАЦІК + КАЛІФ-БУСЕЛ»** — аўдыёкасэты з запісамі казак, калыханак, песьняў для маленькіх беларусаў.

*Кошт відэакасэты — 900 тыс. руб., кошт аўдыёкасэты — 350 тыс. руб. Касэты можна атрымаць, пералічыўшы грошы звычайным паштовым пераказам на рахунак: ЗАТ «Сотвар» р/р 3012000000195 у філіі 506 ААБ «Беларусбанк», код 809. У графе «Для пісьмовага паведамленьня» напішыце, якую касэту Вы замаўляеце. Менчукі! Зьвяртайцеся на тэл.: 8 (017) 228-45-88.*

Гуртам — зьніжка! Тэлефануйце!




## ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ ЧЫТАЧОЎ У МЕНСКУ

Каб чытаць сьвежы нумар «НН» у дзень выхаду – у панядзелак – і пры гэтым эканоміць час і грошы, аформіце падпіску ў бліжэйшым шапіку «Белсаюздруку», а атрымліваць газэту можна ў любым менскім газэтным шапіку.

Зь ліпеня 1999 г. падпіску «да запатрабаваньня» прымаюць 32 газэтныя шапікі. Менскі «Белсаюздрук» гарантуе выдачу газэты па падпісным абанэмэнце ў дзень выхаду газэты, а таксама захаваньне не забраных вамі асобнікаў праз увесь падпісны пэрыяд.

Кошт падпіскі на «НН» на месяц (з кастрычніка) – **192 000** руб. (4 нумары ў месяц, газэта выходзіць на 12 старонках). Падпіска «да запатрабаваньня» прымаецца да 23 дня перадпадпіснога месяца ў крамах і шапіках «Белсаюздруку» г. Менску. Даведацца і высьветліць няясныя пытаньні можна па тэл. 227-88-41 у спадарыні Натальлі Сьвятохі.

Звычайная падпіска па краіне на IV квартал 1999 году.
Кошт на 1 месяц - 212 000 рублёў, на 3 месяцы - 636 000 рублёў.

НАША НІВА

Ніжэй мы падаем сьпіс пунктаў, дзе можна падпісацца й забіраць газэту:

1. Кастрычніцкі пункт падпіскі, вул. Жукоўскага, 5, к. 1
2. Партызанскі пункт падпіскі, вул. А.Кашавога, 8
3. Першамайскі пункт падпіскі, пр. Ф.Скарыны, 113
4. Фрунзенскі пункт падпіскі, вул. Рам. Слабада, 9
5. Крама № 1 вул. Жукоўскага, 5
6. Крама № 2 пр. Ф.Скарыны, 44
7. Крама № 3 пр. Ф.Скарыны, 76
8. Крама № 4 вул. Леніна, 15
9. Крама № 6 вул. Філімонава, 1
10. Крама № 7 вул. Якуба Коласа, 69
11. Крама № 8 вул. Сурганава, 40
12. Крама № 9 пр. Ракасоўскага, 140
13. Крама № 10 вул. Асіпенкі, 2
14. Крама № 11 пр. Пушкіна, 77
15. Крама № 12 вул. Кіжаватава, 80
16. Крама № 13 вул. Каліноўскага, 82, к. 2
17. Крама № 14 вул. Валадарскага, 22
18. Крама № 15 вул. Танкавая, 16
19. Крама № 16 вул. В.Харужай, 24
20. Крама № 17 вул. Якрасава, 35
21. Крама № 18 ст. м. «Плошча Перамогі»
22. Крама № 19 пр. Машэрава, 51, к. 1
23. Крама № 20 вул. Ясеніна, 16
24. Крама № 21 станцыя мэтро «Пушкінская»
25. Крама № 23 вул. Славінскага, 36
26. Крама № 24 вул. Жылуновіча, 31
27. Шапік № 34 гатэль «Менск», пр. Ф.Скарыны, 11
28. Шапік № 136 ст. м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі Фізкультуры
29. Шапік № 187 гатэль «Беларусь», вул. Старажоўская, 15
30. Шапік № 262 гатэль «Плянэта», пр. Машэрава, 31
31. Шапік № 78 гатэль «Юбілейны», пр. Машэрава, 19
32. Крама №25 вул. К.Маркса, 21
33. Шапік №2 Лінгв.унів-т, вул. Захарава, 21
34. Шапік №16 Гатэль «Сьвіслач», вул. Кірава, 13
35. Шапік №18 Тэхн.унів-т, вул. ССвярдлова, 13/4
36. Шапік №37 Дом Ураду, вул. Савецкая, 11
37. Шапік №38 Педаг.унів-т, вул. Савецкая, 18
38. Шапік №40 Мінгарвыканкам, пр. Ф.Скарыны, 8
39. Шапік №88 Мінаблвык-м, вул. Энгельса, 4
40. Шапік №95 вул. Мясьнікова, 39
41. Шапік №198 Эканамічны унів-т
42. Шапік №209 МАЗ. вул. Сацыялістычная, 2
43. Шапік №228 Унів-т культуры. вул. Рабкораўская, 17
44. Шапік №232 МЭХ, пр. Машэрава
45. Шапік№243 Саўмін, вул. Савецкая, 9
46. Шапік №245 Бальніца хут. Дапамогі, вул. Кіжаватава, 56
47. Шапік №298 пр. Машэрава, 75/1
48. Шапік №302 9-я бальніца

ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 63125

# РАСКОЛАТЫ РУХ



Фота IREX-ProMedia.

Марш Свабоды, 17 кастрычніка, вуліца Першамайская

## Фронт і сэкта

Спаміж інтэрпрэтацыяў расколу, які адбыўся ў Беларускім Народным Фронце, найбольш дакладнай уяўляецца наступная: БНФ раскалоўся на дзьве арганізацыі прынцыпова рознага кшталту — рэлігійную і сьвецкую. Абедзьве хочуць актыўна займацца палітыкай. У рэлігійнай, дзе апосталам і сымбалем веры зьяўляецца Зянон Пазьняк — мінімум рэалізму. Затое шмат Пазьняка. Так і павінна быць. Просты адказ на ўсе жыцьцёвыя пытаньні не ў ідэях ці праграмных лёзунгах, а ў асобе лідэра. Нас, прыхільнікаў нацыянальнага адраджэньня, ужо дастаткова шмат, каб з агульнага вылучылася група людзей, якім гэтага дастаткова. Урэшце сапраўды ня ўсім патрэбны той прагматычны штодзённы працэс, праца з кампрамісамі, перамовы, шахматнае мысьленьне, выпрацоўка стратэгіі і тактыкі. Ёсьць сымбаль веры, які замяняе сабою ўсё, у тым ліку і памкненьні сваіх прыхільнікаў. Ініцыятыва не пажаданая, крытэры далучанасьці — асабістая адданасьць. Выгада ў тым, што ўвесь працэс можа адбывацца віртуальна або нават праз мэдыятацыі. У арганізацыі Пазьняка зусім не абавязкова будуць толькі пэнсіянэры і палітычныя аўтсайдэры, там можа быць і моладзь, бо ёсьць свая, своеасаблівая пэрспэктыва. Што з гэтага будзе далей — пакажа час. Можа быць вузкая сэкта, можа — нешта накшталт «Аум сынрыкё», а можа нават свой Талібан. У кожным разе, мэтадалягічна гэта ніяк не палітычная партыя ці рух. Але, безумоўна, знойдуцца людзі, якія падтрымаюць і такое.

Прычына ў тым, што людзі самі па сабе розныя. Хтосьці схільны сядзець у бюро, а камусьці бліжэй цэлы дзень лётаць па горадзе. Хтосьці кладзецца позна, а хтосьці рана ўстае. Тое самае і ў грамадзкім спэктры.

Таму нельга глядзець на вылучэньне сэкты Пазьняка як на штосьці адмоўнае. Проста ў адзіным руху розным людзям стала цесна. Іншая рэч, цяжка ўявіць сабе, што калі-небудзь у Беларусі сфармуецца рэлігійны лад і запануе свой, беларускі культ асобы. Таму ў сэкты Пазьняка няшмат шанцаў на атрыманьне ўлады ў грамадзтве. Хоць, зь іншага боку, гэта й ня так важна. Для нашых тэмпэратурных умоваў такой арганізацыі нашмат зручней заставацца ў вечнай апазыцыі, што дае адчуваньне бясконцага змагарства і напаўняе сухія палітычныя фармулёўкі словамі ад сэрца.

Другая частка БНФ — гэта пакуль што толькі штаб. Харызма і фанатычная адданасьць пакінулі гэтых людзей. У іх застаўся рух, але нацыянальную ідэю ім належыць сфармуляваць па-новаму. Яны пазбыліся выратавальнага слова «Пазьняк», якое ўвасабляла ў сабе тую ідэю дагэтуль, калі дастаткова было яго вымавіць, і без дадатковых тлумачэньняў загараліся вочы. Новага Пазьняка яны ня створаць, бо ня ставяць такой мэты, і ім давядзецца браць кожнага разу рацыянальным вытлумачэньнем, умець пераконваць і пры гэтым весьці сваю лінію. Гэта нашмат цяжэй, але гэта ўжо палітыка.

Найважнейшы эвалюцыйны вынік расколу — разбураная манаполія БНФ на нацыянальную ідэю. Цяпер хто хочаш можа змагацца за Беларусь і Беларусь будзе не абавязкова азначаць — Пазьняк.

## Не сваё

Вельмі істотны раскол адбываецца ў розумах пэўнае групы людзей і не заўсёды бачны няўзброеным вокам. Маю на ўвазе ўсьведамленьне свайго і чужога.

**Калі Ціцянкоў на даху былога ЦК здымаў бел-чырвона-белы сьцяг, ён ня меў ніякіх пачуцьцяў да жалезнага флагштоку, выраблёнага на заводах Крупа і ўсталяванага фашыстамі. На нямецкі флагшток быў вернуты сьцяг марыянэткавай БССР. Непарушнасьць рэчаў, што сымбалізуюць панаваньне ў Беларусі чужых уладаў з цэнтрам у Бэрліне ці Маскве і зьнішчальніцкі азарт у дачыненьні да сымбалю свайго, беларускага — тыповыя рысы палітычнага Менску.**

Калі Лукашэнкаў заўгас Ціцянкоў на даху былога ЦК КПБ здымаў бел-чырвона-белы сьцяг і рваў яго на кавалкі, ён, магчыма, і чуў нешта пра дружыны СБМ, што маршавалі пад гэтым сьцягам у акупаванай немцамі Беларусі. Але ўжо напэўна ён ня меў ніякіх пачуцьцяў да жалезнага флагштоку, выраблёнага на заводах Крупа і ўсталяванага фашыстамі. На нямецкі флагшток быў вернуты сьцяг марыянэткавай БССР. Разуменьне непарушнасьці першага і другога — рэчаў, што сымбалізуюць панаваньне ў Беларусі чужых уладаў з цэнтрам у фашысцкім Бэрліне і камуністычнай Маскве — і радасны зьнішчальніцкі азарт у дачыненьні да рэчы, якая сымбалізуе сваё, беларускае — гэта, на жаль, тыповыя рысы афіцыйнага ці ўвогуле палітычнага Менску. Ціцянкоў адчуваў радасьць ад зьнішчэньня ворага — вось што галоўнае. Акалічнасьці яго не цікавілі.

Гэткае самае пачуцьцё перажываў і беларускі савецкі дасьледчык фашызму Іван Сачанка, калі пісаў, што беларускага ксяндза Гадлеўскага расстралялі савецкія партызаны. Насамрэч дакумэнтальна пацьверджаны факт, што змагара за беларусізацыю касьцёла айца Вінцука Гадлеўскага расстралялі нямецкія фашысты. Але для Івана Сачанкі галоўнае ня тое, хто забіваў, а тое, што забілі ворага. І тут што савецкія партызаны, што нямецкія фашысты — неістотна, бо гэта як бы «нашы». Хоць па ўсіх раскладках менавіта беларускі патрыёт Гадлеўскі мусіў быць для беларускага дасьледчыка сваім.

Яшчэ прыклад. Калі Аляксандар Лукашэнка ў сваіх рускамоўных выступах згадвае апазыцыянэраў, у тым ліку і дэпутата Лябедзьку, ён з найвялікшай грэбліваьцю называе яго ў двукосьсях «змагаром». Беларускае слова тут — эўфэмізм самай абразьлівай лаянкі. Калі ж дэпутат Лябедзька ў сваіх рускамоўных артыкулах імкнецца адказаць Лукашэнку адэкватна, каб чым балючэй абразіць яго, ён піша: «Нас заставляют поверить, что только шкловская земля рождает политических деятелей и только руководитель посредственного хозяйства способен правильно «кировать» державой». Гэтак рускамоўная апазыцыя пераплёўваецца з рускамоўным афіцыёзам пры дапамозе беларускае мовы, тым самым адводзячы ёй ролю пляўка.

Сваё — мова, гісторыя, сьцяг — у гэтых прыкладах ператвараецца ў чужое, варожае. Што падзьвігае людзей паводзіць сябе такім чынам? На маю думку, імкненьне выступаць на баку мацнейшага. Прычым гэтыя мацнейшыя не абавязкова расейскі імпэрыялізм ці нямецкі фашызм. Гэта можа быць і агулам узятая дэмакратыя.

## Дзень Мовы

Цяпер — да самых сьвежых уражаньняў. Пра «Марш Свабоды», які адбыўся ў Менску 17 кастрычніка. Назіраючы яго, мне думалася пра нашаніўскую ініцыятыву — Дзень без чужога слова.

**Без ідэалу апазыцыйныя акцыі ператвараюцца ў бязмэтнае хаджэньне.**

Вы не забыліся? Другі дзень кожнага месяца, пачынаючы зь леташніх Дзядоў — гаварыць і слухаць, чытаць і пісаць толькі па-беларуску. А што рабіць, калі табе ў гэты самы дзень даюць у рукі ўлётку «Маршу Свабоды» або газэту «Навіны», дзе няма ні слова па-беларуску? Не чытаць? Не даведацца пра дэманстрацыю, на якую зьбяруцца тыя, хто за свабоду? Чаму арганізатары не прадугледзелі твайго права і твайго жаданьня? Штосьці падобнае ты з дня ў дзень назіраеш у паводзінах аўтарытарнага рэжыму Лукашэнкі. А тут — дэмакраты. Можа быць, у цябе і ў іх розныя жаданьні?

**Што рабіць, калі табе даюць у рукі ўлётку «Маршу Свабоды» або газэту «Навіны», дзе няма ні слова па-беларуску? Не чытаць?**

У Беларусі няма чалавека, які б не зразумеў тых газэтак па-беларуску. Дый прыклад колішняй «Свабоды», якая выходзіла ўся клясычным правапісам і стала самай масавай апазыцыйнай газэтай, сьведчыць, што аргумэнты пра «народ ня пойме» надуманыя.

Мяне тут цікавіць адно пытаньне. А чаго хочуць нашы рускамоўныя дэмакраты? Я імкнуся, так бы мовіць, зьверыць пасылы. Асабіста я бачу мадэль Беларусі на прыкладах балтыйскіх краінаў або, скажам, Чэхіі, а можа нават і Нарвэгіі. Расея, Польшча і Ўкраіна не разглядаюцца, бо ў шмат разоў большыя за нас. Ва ўсіх жа сумаштабных дзяржавах дэмакратыя збудаваная на падставах нацыянальнай дзяржаўнасьці. Больш за тое, мне бачыцца адрозьненьне Беларусі ад згаданых краінаў-прыкладаў — у нашай нацыянальнай спэцыфіцы. Гэта мусіць быць беларуская Беларусь. І менавіта ў яе небеларускасьці мне бачыцца яе сёньняшні гаротны і застойны стан. Такім чынам, мне нескладана распавесьці, чаго я хачу. А чаго хочуць аўтары рускамоўнай газэты «Навіны»? Скінуць Лукашэнку? І што тады? Правесьці дэмакратычныя выбары? Але папярэдняя гісторыя паказвае, што ніякага толку ад нашага парлямэнту, выбранага без разуменьня вобразу і будучыні краіны, няма. Згадайце, хто з папярэдніх кіраўнікоў не імкнуўся далучыць Беларусь да Расеі. Менавіта таму, што ён выберацца, а што далей — не ўяўляе. І давай скоранька — інтэгравацца.

Праблема ж ня ў тым, з Лукашэнкам ці безь яго. Праблема ў станаўленьні беларускае грамадзянскае супольнасьці. А найлепшыя прыклады, зноў такі, іншых краінаў рэгіёну, паказваюць, што менавіта мова становіцца аб'яднаўчым фактарам для такой супольнасьці.

## Пахаджане

Энэргія натоўпу ўвасабляе гарманічны парыў. Нават калі формы, у якія гэтую энэргію ўстаўляюць аргінізатары, — іншыя. Колькі хочаш пішы на транспарантах «независимость», ня будуць людзі скандзіраваць гэтае слова, як і «Живет Беларусь», напрыклад. Шматтысячны голас рускамоўнага паняволі натоўпу ўсё адно будзе зьліваца ў словах «незалежнасьць» і «жыве». І тут сапраўды не пазьбегнуць уражаньня, што форма эксплюатуе зьмест, выкарыстоўвае прыроднае памкненьне, энэргію свабоды.

Апазыцыя расколваецца ў сваіх партыях і аб'ядноўваецца дзеля супольных акцыяў, але няма, не паўстае з гэтага ўсяго Беларусі. Відавочна недастаткова сабраць сто тысяч, альбо злучыць рукі дзеля газэтнага здымку. Трэба злучыць арыенціры, ідэйныя матывы, бачаньне той Беларусі, якая мае быць. Бо як ні круці, не скандзіруецца ў нас «независимость».

Без ідэалу апазыцыйныя акцыі ператвараюцца ў бязмэтнае хаджэньне, бо сапраўды ж ня можа быць мэтай скінуць Лукашэнку. Гэты чыста адмоўны пасыл заслабы, бо нішто не гарантуе ад новага і яшчэ горшага Лукашэнкі, якога зноў можна выбраць на справядлівых выбарах. Значыць і патрабаваньне выбараў — недастатковае. А самае галоўнае — разуменьне Беларусі — усё ніяк не даецца або зь лёгкасьцю ігнаруецца, пра што сьведчаць тыя ж рускамоўныя ўлёткі.

У выдавецтве «Наша Ніва» XX стагодзьдзе сымбалічна завяршаецца новай кнігай Васіля Быкава, якую аўтар назваў загалоўкам адной сваёй прыпавесьці — «Пахаджане». Цяпер кніга рыхтуецца да друку. Менавіта слова «Пахаджане» згадваецца, калі думаеш пра сэнс і плён цяперашніх дэманстрацыяў. Яшчэ больш сымбалічна гэта ўсё выглядае, калі згадваеш пачатак стагодзьдзя, Купалаў верш «А хто там ідзе». Беларусы, якія сто гадоў ходзяць і ходзяць, ды ўсё ніяк не знаходзяць сваю Бацькаўшчыну. Можа быць гэта было нашае наканаваньне ў мінулыя сто гадоў. І наступны век напоўніцца зусім іншым сэнсам. Хоць бы такім, якім было напоўненае стагодзьдзе дзевятнаццатае, калі стварылася наша нацыя.

**Сяргей Паўлоўскі**

Фота IREX-ProMedia.

Менск. Чэмпіянат сьвету па кікбоксінгу

# БЕЛАРУСЬ — СЛАВЕНІЯ: ЗНАЙДЗІ 10 АДРОЗЬНЕНЬНЯЎ

Беларускім аматарам спорту, што за часоў Савецкага Саюзу прызвычаіліся да вялікіх перамог «нашых» спартоўцаў і да вялікіх супрацьстаяньняў «ЗША — СССР» на Алімпіядах, дагэтуль цяжка ўспрымаць іншыя маштабы. Апошнія гады, якія прынесьлі нам адно расчараваньні, даюць падставы зьвярнуць увагу на досьвед краіны, вельмі падобнай і адначасова не падобнай на Беларусь найноўшага часу — Славеніі.

Славеніі пашанцавала: яе амаль не закранула вайна ў Югаславіі, што дазволіла спакойна праводзіць радыкальныя палітычныя і эканамічныя рэформы. Беларусь жа за 8 гадоў так і не прыступіла да сур'ёзнага рэфармаваньня сваёй эканомікі, паступова праядаючы тое, што засталося ад савецкага часу. Імкнучыся кантраляваць усё і ўсіх, дзяржава вырашыла ўзяць на сябе і клопат пра вялікі спорт. Узяць узяла, але надарвалася: сумы, што неабходныя для існаваньня баскетбольным, гандбольным і г.д. клюбам аказаліся дзяржаве не па кішэні.

Гандбол за савецкім часам быў спортам N1 (па дасягненьнях) у Беларусі. Славуты менскі СКА некалькі разоў выйграваў у 80-я Кубак Чэмпіёнаў і Кубак Кубкаў і справядліва лічыўся лепшым гандбольным клюбам сьвету. Але апошні посьпех на эўрааэне датуецца для нас 1992 годам, калі СКА дайшоў да фіналу Кубка ЭГФ, трэцяга па значнасьці эўрапейскага турніру. Сёньня СКА (які дагэтуль ня мае канкурэнтаў унутры краіны) прайграў барацьбу за выхад у Лігу Чэмпіёнаў.

Славенскі «Цэле» штогод без праблемаў выходзіць у Лігу Чэмпіёнаў і пасьпяхова там гуляе.

7 беларускіх гандбольных клюбаў стартавалі сёлета ў эўракубках, пяць зь іх вылецелі ўжо на першай стадыі, а два астатнія (мужчынскі і жаночы «Аркатроны») стопрацэнтова выляцяць у наступным. У той час як Славенія выставіла на старт 8 клюбаў і 7 зь іх упэўнена выйшлі ў наступны этап.

Сытуацыя з баскетболам у Беларусі адрозьніваецца ад гандбольнай не нашмат. З аднога боку, чэмпіянат Беларусі сярод мужчынаў з пэўнай нацяжкай, але можна назваць спаборніцтвам: у краіне ёсьць тры прыблізна роўныя па клясе клюбы — "Горадня-93", РТІ-АЗАА (нашчадак менскага РТІ — удзельніка чэмпіянату СССР) і "Гомельскія рысі". Першыя два рэгулярна разыгрываюць паміж сабой чэмпіёнскі тытул. Але які ўзровень баскетболу дэманструюць гэтыя клюбы? Толькі дзьве каманды дазволіла выставіць эўрапейская баскетбольная федэрацыя Беларусі ў трэцім па рангу эўрапейскім спаборніцтве — Кубку Корача. "Гомельскія рысі", "без варыянтаў" прайгралі ў кваліфікацыйным раўндзе украінскаму "Кіеву", а чэмпіён Беларусі "Горадня-93" хаця і перайграў фінскі "Лахці", але ў сваёй падгрупе выглядае яўным аўтсайдэрам.

А ў гэты час чэмпіён Славеніі сярод мужчынаў клюб «Півавар на» выступае ў Лізе Чэмпіёнаў. Яшчэ дзьве каманды гуляюць у другім па рангу турніры: Кубак Сапорты («Савіньскі» і «Крка») і дзьве ў трэцім — Кубку Корача («Лока Кава» і «Слован»). Для больш дакладнай карціны дадамо, што летась адным зь лепшых клюбаў у Эўропе стала «Алімпія» зь Любляны. У жаночым беларускім баскетболе сытуацыя яшчэ горшая: Беларусь ужо некалькі гадоў не ўдзельнічае ў эўратурнірах зусім (!!!) з-за банальнай адсутнасьці грошай. Нязьменны лідар з савецкіх часоў менскі "Гарызонт" штогод перамагае ў пацешным чэмпіянаце Беларусі, а адзіным адносна сур'ёзным спаборніцтвам для яго з'яўляецца першынство Балтыйскай Лігі. Пасьля таго як "Гарызонт" стаў у мінулым сэзоне чэмпіёнам Балтыйскай Лігі, з каманды з-за мізэрных заробкаў сышлі пяць вядучых баскетбалістак і галоўны трэнэр. А славенскі чэмпіён «Ежыка» гуляе ў Лізе Чэмпіёнаў, яшчэ некалькі камандаў Славенія мае ў турнірах ніжэйшага рангу.

Ёсьць такая вядомая прыказка: "моцныя клюбы — моцная зборная". І беларускія зборныя па гандболе (і мужчынская, і жаночая), і беларускія зборныя па баскетболе (і мужчынская, і жаночая) цалкам адпавядаюць гэтай прыказцы. Беларускія гандбол і баскетбол адміраюць, як маманты.

Пра тое, што славенскі футбольны чэмпіён «Марыбар» выступае ў Лізе Чэмпіёнаў, я маўчу.

**Андрэй Андрыеўскі**

## дзе варта быць

### Дзеяньні

31 кастрычніка — традыцыйная сустрэча на Дзяды ва ўрочышчах, дзе НКВД расстрэльвала нашых суайчыньнікаў. У Менску — у Курапатах. Час удакладняецца.

### Музыка

У Канцэртнай залі Філярмоніі 25, 26, 27 кастрычніка ідзе другі беларускі фэстываль эстрадных аркестраў. Мастацкі кіраўнік фэстывалю — Міхал Фінберг. 31 кастарычніка ў нядзелю — канцэрт духоўнай музыкі, прысьвечаны 100-м угодкам з дня нараджэньня Д'юка Элінгтона.

26 кастрычніка ў Залю камэрнай музыкі Філярмоніі запрашаюць студэнты аркестравага факультэту Беларускай Акадэміі Музыкі. 28-га тут Тацяна Старчанка дае канцэрт фартэпіяннай музыкі. У першым аддзяленьні прагучаць творы Баха, у другім — К.Дэбюсі. 29-га у рамках IX фэстывалю «Адраджэньне беларускай капэлы» можна пазнаёміцца з творчасьцю Яна Тарасэвіча (1889--1961). Канцэрт носіць вымоўную назву «Абышоўся бяз славы». Сьпяваюць Віктар Скарабагатаў (барытон) і Тацяна Цыбульская (сапрана).

### Тэатар

У Купалаўскім 26-га — камэдыя М.Задорнава «Таполевая завея», 27-га — «Паўлінка», 29-га і 30-га — пастараль «Ідылія» В.Дуніна-Марцінкевіча. Раніцай 31-га ў нядзелю пройдзе казачны спэктакаль «Пунсовая кветачка». На Малой сцэне 30-га «Дагарэла сьвечачка» — маналёг акторкі. 31-га — вечаровы кактэйль у адной дзеі «Крывавая Мэры».

На «Вольнай сцэне» 26-га — «Узьлёт Артура Ўі, які можна было спыніць»; 29-га, 30-га і 31-га — «Стомлены д'ябал»; 27-га — «Паваліўся нехта».

Тэатар аднаго актора «Зьніч», які месьціцца ў касьцёле Сьв.Сымона і Алены, вядзе 10-ы тэатральны сэзон. 25-га а 10-й у ім Вячаслаў Шакаліда выканае лялечны монаспэктакль паводле П.Васючэнкі і С.Кавалёва «Дзівосныя прыгоды паноў Кубліцкага ды Заблоцкага». У 12.30 — монаспэктакль паводле вершаў Кармэн Барнос дэ Гаштольд «Маленькі анёлак». Выканаўца — Раіса Астрадзінава. А 16-й — п'еса Ф.Дастаеўскага «Кроткая» ў перакладзе А.Каляды. Выканаўца — Уладзімер Шэлестаў. 26-га а 16-й тэатар запрашае на спэктакль «Белы сон», створаны паводле «Споведзі» і вершаў Л.Геніюш, а таксама твораў У.Караткевіча, В.Ластоўскага, А.Разанава. Выканаўца — Галіна Дзягілева. 28-га — «Віленскія мроі» — п'еса, створаная на грунце ўспамінаў Юльяны Вітан-Дубейкаўскай і вершаў Н.Артымовіч.

### Балет

27-га кастрычніка — А.Адан «Карсар», 29-га — балет П.Чайкоўскага «Шчаўкунок», 31-га, у нядзелю, «Лебядзінае возера».

### Опэра

26-га — П.Чайкоўскі «Яўген Анегін», 28-га — П.Чайкоўскі «Віновая дама, 30-га — опэра М.Рымскага-Корсакава «Царская нявеста», 31-га ў нядзелю раніцай опэра для дзяцей С.Кюі «Кот у ботах».

25, 27-га а 19-й — упершыню ў Менску выступленьні кітайскай Цзыліньскай опэры. Яны адбудуцца ў Музкамэдыі, а не ў ДК МТЗ, як раней меркавалася.

### Шоў

31-га а 18-й БМА ладзіць у клюбе Альтэрнатыва (вул.Бяды, 4) музычнае шоў «Helloween». Удзел прымаюць гурты «Зьніч», «Bleeding», «Aqua Morta», «Danger», «Fat Not Dead», «Stokes», «Veld».

### Дыскусіі

26 кастрычніка — прэзэнтацыя часопіса найноўшай гісторыі "Шуфляда". У менскай бібліятэцы імя Янкі Купалы (вул.Харужай, 16). Пачатак а 18.30.




### Выставы

Калі вы займаецеся вытворчасьцю мэблі або жадае набыць новы гарнітур для кавтэры — з 25 да 30 кастрычніка ў выставачных комплексах на праспэкце Машэрава, 14 і вуліцы Янкі Купалы, 27 пройдзе пятая спэцыялізаваная выстава «Мэбля-2000». Прэзэнтуюцца як матэрыялы для вытворчасьці мэблі, так і тое, што зь іх вырабляюць. Звычайна беларускія вытворцы прадстаўляюць на гэтай выставе навамодную, несэрыйную мэблю і часта прадаюць гэтыя ўзоры, каб ня везьці назад на фабрыку.

**Алесь Кудрыцкі**

# ДАВІМ ГАДЗІНУ!

***Каля 300 чалавек завіталі на канцэрт «Раздавім фашысцкую гадзіну!», што прайшоў у мінулую суботу ў Палацы Культуры МТЗ. Імпрэза ператварылася ў беспасярэдні працяг «крывавай нядзелі» 17-га кастрычніка.***

«Чырвоны жонд» — арганізатары акцыі — ізноў змаглі згуртаваць вакол сябе маладзёвыя масы пасьля згубы «Сьвінога рыла». Справа ў тым, што два тыдні таму на Алеся Мазура наехала братва, якая чамусьці вырашыла, што вечарыны на «хутары бліз Валадаркі» павінны праходзіць пад іхным «дахам». За што, безумоўна, прапаноўвалася выплочваць ім грошы па існуючых расцэнках. Алесь спрабаваў пратэставаць, але... Кавярня «Валерыя» назаўжды прычыніла свае дзьверы для менскіх анархістаў і раздалбаяў, а жондаўцы цяпер актыўна шукаюць якую-небудзь пралетарскую піўнуху для працягу актыўнага наступу на контракультурным фронце.

Канцэрт «Раздавім фашысцкую гадзіну!» насамрэч выдаўся адпадны: адзін з маладых тусоўшчыкаў згубіў прытомнасьць проста ў бары і быў вывезены хуткай дапамогай. Адно, праўда, гук быў дрэнным, і таму заклікі і рыкі музыкаў спачатку амаль не ўспрымаліся публікай. Замест берасьцейскага гурту «Наизнанку», у якім захварэў бубнач, на сцэну выйшла незаяўленая «Правакацыя», і ўжо ад самага пачатку іхнага выступу стала ясна, што падзеі тыднёвай даўніны надалі імпрэзе актуальнасьці. Першаю песьняй стала «Карычневае», а далей палілася лірыка, аздобленая радкамі тыпу «Ён я...е лялек у рот».

Затым з-за даляглядаў выпаўзла «Сонца Мао», чый саліст Юрась Канавальчык сваю самую радыкальную кампазыцыю «Молатаў-кактэйль» прысьвяціў тым, хто кідаў 17-га каменьне ў «мянтоў» (пра якіх у мааістаў таксама ёсьць песьня з адпаведным назовам). Калі прысьвячэньне прагучала, ледзь не палова залі пачала скакаць і крычаць: «Я кідаў, я!»

Саліст трэцяга гурту «Hate To State», ізноў такі Мао, олдаўскі панк, сваім, на жаль, расейскім рыканьнем у мікрафон выказваў сваю нянавісьць да дзяржавы, McDonald's'у, пэруанскага дыктатара Фухіморы, выбараў і палітыкаў, а свой выступ скончыў палымяным заклікам: «Беларусь —партызанскі край. Ня трэба баяцца змагацца. Гэта нашая краіна!»

Піцерскія ж госьці — «Бандзінскі» — парадавалі папярэдняй прамовай па-беларуску, якую, па чутках, ім напісаў Лёлік Ушкін, і тым, што толькі ад іх са сцэны неслася гучнае «Жыве Беларусь!» Парадавалі і добрым саўндам, сваёй сыгранасьцю і стылёвай арыгінальнасьцю. Самымі забойнымі сталіся «Горы Пэру» (зноў пра гаротніка Фухіморы), «Дай денег» і «Румба». Расейскія музыкі, якія, дарэчы, перадалі прывітаньне ад піцерскіх скіноў нашым, саступілі месца доўгачаканаму «Deviation'у» з Горадні, якія адлабалі свае вядомыя гіты пра грамадзянскую вайну, таталітарызм і палітычных прастытутак са свайго апошняга альбому «Х...й вам або Таталітарызм ня пройдзе», а таму лейтматывам выступу сталася фраза Стаса Пачобута «Кожны камень — гэта х...й у ср...ку дыктатуры», пасьля якой адміністрацыя, асьцерагаючыся нарастаньня радыкальных настрояў у добра падпітым натоўпе, акцыю перарвала ўжо а дзявятай гадзіне замест заплянаванага заканчэньня а палове на адзінаццатую.

**Анатоль Прасаловіч**


**БЕЛАРУСКАЯ СЛУЖБА РАДЫЁ СВАБОДА**

Беларускія перадачы Радыё Свабода выходзяць у эфір тройчы на дзень:

• ПЕРШАЯ ВЕЧАРОВАЯ ПЕРАДАЧА
18.00-19.30 паводле менскага часу (15.00-16.30 UTC)
7295 кгц (41.12 м)
9610 кгц (31.22 м)
11725 кгц (25.59 м)
15565 кгц (19.27 м)

• ДРУГАЯ (АБНОЎЛЕНАЯ) ВЕЧАРОВАЯ ПЕРАДАЧА
22.00-23.30 паводле менскага часу (19.00-20.30 UTC)
6105 кгц (49.14 м)
9535 кгц (31.46 м)
9750 кгц (30.77 м)
11865 кгц (25.28 м)

• РАНІШНЯЯ ПЕРАДАЧА
(ПАЎТОР ПЕРШАЙ ГАДЗІНЫ ДРУГОЙ ВЕЧАРОВАЙ ПЕРАДАЧЫ)
6.00-7.00 паводле менскага часу (3.00-4.00 UTC)
6065 кгц (49.46 м)
7295 кгц (41.12 м)
9635 кгц (31.14 м)
9750 кгц (30.77 м)

Апрача таго, усе нашыя перадачы перадаюцца на сярэдняй хвалі 521 м (576 кгц)



Фота AP

Чачэнскі баец

# ЯКОЮ ПРАЧНЕЦЦА ЎКРАІНА?

*Працяг са старонкі 1.*

Альбо ультраактыўную і ультрарэвалюцыйную Н. Вітрэнку (з надзеяй на тое, што ейныя абяцанкі паслаць усіх рэфарматараў здабываць уран усё ж такі настрашаць выбарцаў).

Адным з найважнейшых фактараў стала і трывалае давядзеньне да насельніцтва праз нацыянальныя тэлеканалы вынікаў апытаньняў, якія мусілі сьведчыць наступнае: у другі тур могуць патрапіць толькі гэтыя тры кандыдаты, і таму ў хоць у чымсьці памяркоўных ды разважлівых выбаршчыкаў проста ня будзе іншага выйсьця, як прагаласаваць за Л.Кучму.

Тым часам, вынікі незалежных сацыялягічных апытаньняў сьведчылі зусім аб іншым. Сапраўды, выхад у другі тур Л. Кучмы гарантаваны, ён зьбярэ больш за 20% галасоў — бо надта ж ужо вялікія грошы і высілкі пакладзеныя на яго кампанію. На другое месца амаль з аднолькавым правам могуць прэтэндаваць, маючы кожны па 13—14% прыхільнікаў, Я.Марчук, А.Мароз, П.Сіманенка ды Н.Вітрэнка. І калі выхад у другі тур кагось з апошніх двух напэўна ткі робіць Л.Кучму прэзыдэнтам на другі тэрмін, то з Марчуком ці Марозам змагацца Кучму значна цяжэй (тым больш, што ў другім туры каманды Марчука і Мароза ўжо напэўна скаардынуюць свае дзеяньні).

Сёньня наўрад ці можна прагназаваць вынік украінскіх выбараў. Аднак, ад таго, якою прачнецца Ўкраіна «32 кастрычніка», залежыць яе шлях разьвіцьця на час, магчыма, больш працяглы за наступнае пяцігодзьдзе.

Л.Кучма пры ўладзе нясе небясьпеку канчатковага замацаваньня «лацінаамэрыканскага» сцэнару разьвіцьця Ўкраіны, — з аўтарытарызмам і карупцыяй ды галечай большасьці народу. Яго адрозьненьне ад беларускага палягае хіба толькі ў тым, што Л.Кучма не зьбіраецца скасоўваць нацыянальную сымболіку і стараньня на людзях карыстаецца ўкраінскай мовай (і за гэта, як кажуць, дзякуй...)

Які шлях абярэ для сябе Ўкраіна — хутка пабачым. Да «32 кастрычніка» застаецца тыдзень.

**Максім Стрыха**

# УКРАІНЦЫ Й МАЛДАВАНЕ ТРЫВОЖАЦЦА ЗА БЕЛАРУСЬ

З ініцыятывы лідэра Ўсеўкраінскага аб'яднаньня «Адкрытая палітыка» народнага дэпутата Ўкраіны Анатоля Матвіенкі ў Вярхоўнай Радзе распаўсюдзілі зварот да Аляксандра Лукашэнкі, у якім выказваецца трывога з нагоды разьвіцьця падзеяў у Беларусі: зьнікненьня апазыцыйных палітыкаў, арыштаў і зьбіваньнямі ўдзельнікаў масавых акцыяў пратэсту. Зварот заклікае да дэмакратызацыі Беларусі, правядзеньня вольных прэзыдэнцкіх і парлямэнцкіх выбараў, вяртаньня Беларусі ў эўрапейскую сям'ю. Зварот падпісалі 37 дэпутатаў ад розных фракцыяў — ад левых да правых і перадалі па дыпляматычных каналах адрасату.

Аналягічны ліст з пратэстам супраць расправы над удзельнікамі пратэстаў 17 кастрычніка падпісаў 51 (са 105 усяго) парлямэнтар Малдовы, сярод іх і былы прэзыдэнт Малдовы Мірча Сьнегур.

**Б.Т.**

# ДЗІЎНЫЯ ВЫБАРЫ

Віталь ПАНАМАРОЎ

Параўнаньне гэтых выбараў прэзыдэнта Ўкраіны з папярэднімі дэманструе нашы «дасягненьні» ў разбудове ўкраінскай дэмакратыі. «Выбары '91» праходзілі на хвалі нацыянальнай рэвалюцыі, пасьля вызваленьня Ўкраіны, забароны кампартыі, гібелі імпэрыі, вяртаньня ў Эўропу, звабы свабоды. Натомест «Выбары '99» — гэта канеўскі «саюз мяча і рала», абыякавасьць выбарцаў, прывід дыктатуры, славянскі фундамэнталізм ды супольная дэманстрацыя любові да Масквы.

Выбары надзялілі індывідуальнасьцю звычайна бясколерных украінскіх палітыкаў, хоць іх праграмы ня дужа каб розьніліся адна ад адной.

Кучма схільны пазбывацца прыхільнасьці пэнсіянэраў і жыхароў Паўднёвай Украіны, якія 5 гадоў таму прывялі яго да ўлады (украінцы ўжо склалі прыказку, што прэзыдэнтаў абіраюць на Ўсходзе, а любяць на Захадзе). Найлепш пашэнціла выказаць свае ўражаньні ад сёлетняй украінскай выбарчай кампаніі прэзыдэнту адной сяброўскай цэнтральнаазіяцкай краіны ў ягоным прынародным звароце да цяперашняга прэзыдэнта Ўкраіны: «Дарагі Леанід Ільіч!» Аднак чамусьці ня хочацца суцяшацца гатовасьцю мільёнаў сяброў такога сабе нефармальнага выбарчага аб'яднаньня пад віртуальнаю назваю «Абы ня Кучма» аддаць галасы (то бок уладу) абы-каму, абы ён паабяцаў/паабяцала вяртаньне да «шчасьлівага мінулага».

Найбольш папулярнаю ў кандыдатаў (і, адпаведна, у выбарцаў) апынулася архаічная ідэя славянскага адзінства. Нэаславянафільства спавядаюць 6 з 15 кандыдатаў.

Масавае старэньне насельніцтва Ўкраіны за апошняе дзесяцігодзьдзе, вельмі заўважнае нават на вуліцах, робіць старых людзей, былога «савецкага чалавека», самаю шматлікаю і палітычна найбольш актыўнаю групаю выбарцаў. Таму ня дзіва, што толькі 4 кандыдаты адкрыта падтрымліваюць прыватную ўласнасьць на зямлю. Праўда, сустракаюцца й зусім як на сёньняшнія часы экзатычныя кандыдаты, напрыклад, Уладзімер Алійнык з экзатычнаю для сучаснай Украіны ідэяй правядзеньня люстрацыі.

Усё нейкае хімэрнае ў кампаніі гэтага году. Колішнія дысыдэнты падтрымліваюць генэрала КГБ Марчука. Антыкамуніст Алійнык аб'яднаўся ў Каневе зь ленінцам Ткачэнкам і марксістам Марозам. Ад кінутых пад ногі Вітрэнцы гранатаў пацярпела не яна, а цалкам выпадковыя людзі. Сацыяліст Марароз і прагрэсіўная сацыялістка Вітрэнка вінавацяць адзін аднаго ў «рэвізіянізьме», што, аднак, не азначае сутнасных разьбежнасьцяў у іхных прграмах.

Трохі неспадзяваным аказаўся ўва ўкраінскай кампаніі беларускі сьлед. Прэзыдэнт Кучма таксама выступіў з прапановамі ўтварыць двухпалатны парлямэнт ды правесьці рэфэрэндум. Праваднікамі дзяржаўнай палітыкі што да незалежных газэтаў і тэлеканалаў таксама сталі пажарнікі ды падаткавікі. Праўда, палітыкі ўва Ўкраіне пакуль не зьнікаюць, а трапляюць у аўтакатастрофы. А вось на пытаньне пра сустрэчу Леаніда Кучмы зь Сямёнам Шарэцкім прэс-сакратар прэзыдэнта адказаў: сустрэчы ня толькі не было, але яна й не плянавалася.

Менскі нядзельны «Марш Свабоды» меў водгукам узмоцненыя меры бясьпекі ў Кіеве. Дзяржаўны тэлеканал УТ-1 паведаміў пра выкрытыя намеры выбарчых штабоў «асобных кандыдатаў» арганізаваць беспарадкі каля Адміністрацыі прэзыдэнта, а начальнік кіеўскай міліцыі заявіў пра ўвядзеньне ўзмоцненай аховы ўрадавых будынкаў.

А выбарцы глядзяць на выбарчыя перагоны як на палітычнае шоў, наладжанае на іх уласныя грошы. Але каму ўжо абрыдлі гэтыя выбары, церпяць, балазе ўжо няшмат засталося да 31 кастрычніка. Бо паказвае на тое, што ўва Ўкраіне пасьля гэтага ўжо доўга ня будзе дэмакратычных выбараў. ■

# НАЦЫЯНАЛІСТЫ КІРУЮЦЬ НАЙБУЙНЕЙШАЙ ДЭМАКРАТЫЯЙ У СЬВЕЦЕ

Зьміцер ПУХАВІЦКІ

У выніку перамогі на парлямэнцкіх выбарах у Індыі ў верасьнікастрычніку бягучага году індуісцка-нацыяналістычная партыя Bharatiya Janata Party другі раз запар сфарміруе ўрад Індыі, галоўны орган дзяржаўнай улады (прэзыдэнт рэспублікі мае хутчэй маральнае значэньне, чым палітычнае). Індыйскія нацыяналісты падалі прыклад таго, як партыя, якая раней была на закамарках палітыкі, можа з бляскам прыйсьці да ўлады.

Варта адзначыць, што Індыя ўяўляе сабою велічэзны вулей нацыянальнасьцяў, моваў (15 нацыянальных моваў і больш за паўтары тысячы дыялектаў), веравызнаньняў (адна толькі мусульманская меншасьць складае каля 120 мільёнаў чалавек, ёсьць там нават і праваслаўныя хрысьціяне). Па тэрыторыі Індыя раўняецца ўсёй Эўропе, уключаючы Беларусь, але без Расеі. Супярэчнасьці на рэлігійнай ці нацыянальнай глебе калі-нікалі перакідваюцца ў пагромы з ахвярамі.

На пачатку 90-ых гадоў BJP фігуравала як адна з самых расколатых партыяў. Індыйскі Нацыянальны Кангрэс, асьвечаны зоркай сям'і Гандзі, амаль нязменна ўздольваўся абганяць на выбарах канкурэнтаў. Пэўна гуляла тут ролю аксіяматычная слава Кангрэсу, як заснавальніка сёньняшняй індыйскай дзяржавы.

На той час BJP прапаноўвала ідэю *Хіндутвы* — «індускасьці», якая б мела стацца аб'яднаўчым духам Індыі. Партыя пераконвала, што дзяржава безадказна здрадзіла сваёй індуісцкай большасьці, бо зашмат паддобрывалася да ўсялякіх меншасьцяў, кшталту мусульманаў. Сп.Адвані, цяперашні міністар унутраных справаў, а тады актывіст BJP, езьдзіў у калясьніцы, прычэпленай да джыпу, па краіне, прапагандуючы *Хіндутву*. Прамовы перад выбарцамі заканчваліся міжграмадзкімі бойкамі, і Адвані ехаў далей. Кульмінацыяй кампаніі BJP стала разбурэньне ў 1992 годзе мячэту Бабры ў штаце Ўтар-Прадэш, якая, маўляў, пабудаваная на месцы нараджэньня індуісцкага бога Рамы. На тым месцы, ці не, але акцыя завяршылася адчайнымі сутыкненьнямі і гібеллю больш за 1000 чалавек. Спляжыўшы мячэт, BJP здолела прыцягнуць некалькі мільёнаў новых прыхільнікаў. Але ў канчатковым выніку палітычны эфэкт аказаўся безнадзейна адмоўным, бо яшчэ больш выбарцаў адштурхнуліся ад партыі. У выніку — ізноў стабільна-заднія лаўкі апазыцыі ў парлямэнце. Большасьць грамадзтва па меншай меры не цікавілася прапанавай BJP ідэяй Хіндутвы. BJP, такім чынам, стала перад вызначальнай дылемай: прызнаць рэальнае становішча рэчаў і ў палітычнай барацьбе часова адсунуць Хіндутву на задні плян ці, сьцяўшы зубы, і далей займацца вызначэньнем, хто ў якога бога верыць, што б эвэнтуальна загнала BJP у малюпасенькую норку электаральнага гета і зраўняла б яе па папулярнасьці з маргінальнымі групоўкамі індыйскіх марксістаў-тэрарыстаў, якія любяць калі-нікалі паграміць багатых дзядзек.

BJP абрала першы варыянт. Пад кіраўніцтвам харызматычнага лідэра Аталы Біхары Ваджапаі партыя пачала пасьлядоўна рухацца ў бок палітычнага цэнтру. З Хіндутвы акцэнт перамясьціўся на такія «прахадныя» пытаньні, як карупцыя і недахопы ў кіраваньні.

Наступным крокам BJP стала стварэньне партыйнай кааліцыі. Раней, пасьля мусульманскіх пагромаў, мала хто жадаў важдацца разам з BJP. Зараз жа, не зьвяртаючы ўвагу на галашэньні некаторых фанатыкаў у сваіх шэрагах, BJP далучылася да сумеснай праграмы з хаўруснымі партыямі, у якой абяцаецца прытрымлівацца мараторыю на абмеркаваньне спрэчных пытаньняў, кшталту аднаўленьня мячэту Бабры.

Такім чынам, падмуркам другой запар перамогі нацыяналістаў сталі прынцыпы кансалідацыі партыі, выбар прагматычнай палітыкі і жаданьне ісьці ў хаўрус з блізкімі партыямі.

Сёй-той папракае, быццам BJP здрадзіла сваім прынцыпам. Тут як глядзець. Бясспрэчна тое, што менавіта за нацыяналістаў Індыя, нягледзячы на адгаворваньні Расеі і ЗША, публічна абвясьціла сябе атамнай дзяржавай, што прывяло да агульнанацыянальнага патрыятычнага ўздыму ў краіне. Нацыянальнаму гонару дадала нядаўняя перамога індыйскай арміі над прапакістанскімі ісламскімі баевікамі ў Кашміры. Фінансавы крызыс, якому толькі крыху не хапіла, каб разбурыць Азію, амаль не закрануў эканомікі Індыі.

Індуісцкія нацыяналісты ўпэўнена ўвядуць найбуйнейшую дэмакратыю ў сьвеце ў трэцяе тысячагодзьдзе, прасядзеўшы амаль пяць дзясяткаў гадоў у апазыцыі. Добра тое, што нацдэмам у іншых краінах, маючы прыклад BJP, зараз ня трэба столькі часу маркоціцца на палітычных закавулках, каб прыйсьці да тых жа самых прынцыпаў перамогі. ■

# ІДЭАЛ СВАБОДЫ

Сяргей ХАРЭЎСКІ

У 1830-м Эжэн Дэлякруа напісаў карціну «Свабода, якая вядзе люд на барыкады». З тае карціны й быў запачаткаваны клясычны вобраз Свабоды, дзяўчыны з аголенымі грудзямі, у фрыгійскім каўпаку, які цяпер ўважаецца за галоўны сымбаль Францыі. На палатне, зьлева ад Свабоды, відаць маладога зухаватага чалавека з цыліндрам набакір, які моцна сьціскае ў руках стрэльбу й рвецца ў атаку. Гэта аўтапартрэт самога Дэлякруа. Мастак не ўнікаў і праўдзівых, брутальных дэталяў — паўраспранёныя, падраныя трупы на пярэднім пляне, парахавы куродым, разьятраны натоўп. Але сьветлая постаць прыгожай дзяўчыны ды чыстыя колеры французскага сьцягу выводзяць гэтую рэч на вышыню яснага сымбалю. Гэтак праўда, перамяшаная з алегорыяй, становіцца больш, чым проста праўдаю.

Мне згадаўся гэты твор днямі ў Вільні. На гэтым тыдні тут пачаліся заняткі ў новага курсу завочнікаў, што навучаюцца на беларускім аддзяленьні ў Пэдагагічным унівэрсытэце. Гэткіх студэнтаў, пераважна з Заходняе Беларусі, набралося з паўтары дзясяткі. І першае ж пытаньне, якое яны мне задалі: «Што адбылося ў мінулую нядзелю ў Менску?» «А вы хіба ня ведаеце, тэлебачаньня не глядзелі?» «Беларускаму мы ня верым!» «А расейскія праграмы?» «Ня верым таксама». Я пачаў быў распавядаць... І міжволі адчуў, што тое, пра што кажу, ня праўда, а *інтэрпрэтацыя*. Я быў на тым Маршы Свабоды, але мог бачыць толькі тое, што абывалася на адлегласьці выцягнутае рукі. Я не пабачыў славутага ахвярнага казла Луку, не пабачыў як падпалілі пошту, не пабачыў як хлопцы сягалі ў халодную брудную Сьвіслач. Не пабачыў і крыві. Але запомніліся вялізарныя сьцягі Беларусі й Эўропы, духавы аркестар, вясёлыя школьнікі са сьвісткамі...

Мастак Дэлякруа ня браў удзелу ў рэвалюцыі 1830 году. Яго не было нават у Парыжы, адкуль ён зьехаў, баючыся за сваё жыцьцё й маёмасьць. Аднак па вяртаньні, ведаючы праты драматычныя падзеі блізу ўсё, ён стварыў шэдэўр. І ўпісаў сябе завочна ў гісторыю, устаўшы на палатне побач са Свабодаю. У мастацтве гэты твор стаў роўны «Марсэльезе» ў музыцы. Ці змог бы мастак узьняцца да гэткага абагульненьня й мэтафарычнасьці, каб сам пасьлізнуўся на лужыне крыві ці пусьціў кулю ў лоб свайму суайчыньніку-жаўнеру? У барыкадных баях, тымчасам, удзельнічалі сотні мастакоў, але вось жа ніхто не ўявіў сабе ідэалу Свабоды...

«Свабода» Дэлякруа, шматкроць экспанаваная, таксама зажыла сваім жыцьцём. Тым часам сам мастак, які з узростам стаў кансэрватарам ды клерыкалам, моцна шкадаваў пра тое, што стварыў гэтае палатно. Ён пісаў, што падпаў пад тлум «гадоў узьнёслых і смутных». На ягоную думку, гэтая карціна беспасрэдна паспрыяла наступным рэвалюцыям. Але рэвалюцыі мінулі, а французскі ідэал Свабоды застаўся.

Прыгадаўшы Дэлякруа, я падумаў, што няварта распавядаць маім студэнтам пра жарсьці, нялюдзкасць ды пра тое, колькі й каго з Маршу Свабоды зьвезла «Хуткая дапамога». Я распавёў ім пра нашыя прыгожыя сьцягі й пра тое, пра што мару сам. Пра Свабоду. ■

# "НАС НЕЛЬГА НАЗВАЦЬ ГЕРОЯМІ"

*Працяг са старонкі 1.*

І менавіта гэтыя, самыя нахабныя, у прынцыпе, больш за ўсіх і атрымалі. Я бачыў, як двое адарваліся мэтраў на сто ад шэрагу, людзі ўбачылі, што за імі нікога няма, іх абкружыла чалавек з дваццаць, аднаго павалілі, забралі шчыт. І калі б ня шолам ягоны ды не рэпартэр зь БелаПАНу, здаецца, міліцыянту было б дрэнна, бо, сапраўды, яго пачалі ўжо нагамі тузаць. І было некалькі такіх выпадкаў. Безумоўна, шкада гэтых хлапцоў, у якіх трапілі камяні, але я ведаю, што на мітынгі бяруць толькі самых актыўных, баявых міліцыянтаў.

Не выключаю таго факту, што адрэналіну ў маёй крыві ў той час было вельмі багата, ува мне прачнуліся іншыя інстынкты — помсты, у прыватнасьці. Шмат хто з нас страціў кантроль над сабой. Але не было нейкага там задавальненьня ад таго, што мы камусьці наносім страты. Гэта быў наш адказ уладам, бо даўно ўжо — паўтары гады — не праходзілі падобныя акцыі, і моладзі трэ было разрадзіцца. Погляды мае не зьмяніліся нават пасьля таго, як я пабачыў міліцыянтаў у шпітальным ложку: ім кампэнсуюць іхныя страты чарговымі чынамі ці мэдалямі, але хто ўзгадае, як яны рабілі рэйд на гастраном, як яны там білі жанчыну зь мехам крупаў?

Кіданьне камянёў — гэта размова з уладамі, зь міліцыяй на іх собскай мове, магчыма, выключна гэты сродак — выкарыстаньне балявога эфэкту — прымусіць іх нас паважаць.

**Вася Бублікаў, Менск, 18 гадоў:**

Нашыя дзеяньні 17 кастрычніка былі тым вылівам усёй агрэсіўнасьці і злосьці, якія накапіліся з-за такога жыцьця ўва ўсёй беларускай сьвядомай грамадзкасьці, у тых, хто ня лічыць сябе быдлам, але жыцьцё іх зрабіла такім. Хутчэй, канечне, намі кіраваў жывёльны інстынкт помсты за тое, што ўлада давяла нас да такога стану. Гэтыя нашыя, магчыма, і нечалавечыя дзеяньні можна ацэньваць па-рознаму. З аднаго боку, гэта, у пэўным сэнсе, было барствам, але калі паглядзець з другога, такімі нас зрабіла ўлада. Мы вымушаныя выкарыстоўваць усе магчымыя сродкі, каб выказваць свой пратэст. Нас нельга назваць героямі, хутчэй, мы выразнікі настрою ў грамадзтве, якое, праўда, стаяла на гары і проста назірала за падзеямі. Іхнымі дзеяньнямі кіравала рацыянальнае пачуцьцё самазахаваньня, над намі ж, моладзьдзю, верх узялі больш радыкальныя памкненьні.

**Ляксей Адашкевіч, электрык, 21 год:**

Калі мы ўбачылі, што мянты пачынаюць выскокваць, хапаць людзей і цягнуць у машыны, мы не маглі застацца спакойна стаяць, апусьціўшы рукі. Калі цябе, маладога хлопца, пачынаюць біць, ці ты не дасі ў адказ? Калі цябе зьбівае міліцыянт, дык чаму ты ня маеш права яму адказаць? Паглядзіце: наўкола бяспраўе, "блакітныя" паўсюль. Калі ты п'еш піва, цябе не чапаюць, але калі ўбачаць, што гарэлку — забіраюць адразу. Нам патрэбная пэўная аддушына. Я разумею: калі б мяне злавілі, дык выперлі б з тэхнікуму, аштрафавалі б на працы. А мне наплюваць: мне не падабаюцца ўлады, мне надакучыла ўжо пяць гадоў сядзець у дзярме ў сваёй краіне.

Ува ўсіх цывілізаваных краінах гэтая калёна міліцыі абкружыла б мітынгоўцаў, праводзіла б да таго месца, куды яны хочуць пайсьці. Дэманстранты б аддалі тую рэзалюцыю, і нічога б не было.

Я са свайго заробку плачу падаткі, каб мая міліцыя мяне ахоўвала. Мая міліцыя мяне біла. І мы нічога не парушалі, адно толькі прыпынілі трохі рух транспарту па горадзе. Але ж была нядзеля, хто там куды сьпяшаўся? І мэтро ж ёсьць, дзякаваць Богу.

Калі наступным разам мяне міліцыя не пачне біць, я ня буду ўжываць фізычную сілу. Але калі я бачу, як ляжыць хлопец, і яго зьбіваюць тры мянты, мне таксама хочацца ўзяць у рукі камень, балазе, іх там было багата. Я працую электрыкам, і ў панядзелак пасьля акцыі я зайшоў, каб нешта паладзіць, у кватэру, дзе жылі міліцыянты. Разгаварыліся пра Марш: яны на ім былі таксама, ясна, што зь іншага боку. Але адзін зь іх, праўда, трохі пад градусам, падышоў да мяне, паціснуў руку і сказаў: "Малайчына, я на вашым месцы зрабіў бы тое самае".

**Конрад Карлавіч, Горадня:**

Тое, што мы ўзяліся за каменьне, было выклікана жорсткімі дзеяньнямі з боку міліцыі, якая пачала валачы мітынгоўцаў за кардон. Каб не яны, мы нічога б ня кідалі, я думаю. Я памятаю, што першы хлопец, які схапіў камень, доўга вагаўся, кідаць яго ці не. А пасьля ўжо ваганьня не было. Ці кіну я камень наступным разам? Пабачым, усё залежыць ад сытуацыі.

**Апытваў Анатоль Прасаловіч**

# ПРАСІЦЬ ПРАБАЧЭНЬНЯ?

Тацяна СЬНІТКО

Давайце разьбярэмся, каму прасіць прабачэньня за 17 кастрычніка, у каго і за што!

Я асабіста ня бачыла моманту, зь якога «пачалося». Як тысячы іншых людзей, у гэты момант я ішла ад кардона — «разыходзілася». Але нас пагналі...

Давайце адразу забудземся на выраз «безвыходная сытуацыя». У нас было ажно тры варыянты, калі нас пагналі ў сьпіну.

1. Бегчы далей. Калі ўцякаем, як быдла — гэта праблема ня наша, а беларускага народу ў цэлым. Потым скажам: «Бедная Беларусь!».

2. Спыніцца. Азірнуцца. Стаяць, пакуль не пагоняць ды не адлупцуюць. Затое потым скажам: «Мы мацнейшыя духам».

3. Абараняцца. Затрыманьні, зьбіцьцё, гвалт, Акрэсьціна, Валадарка — усё гэта й так ужо гарантаванае. Усім. Па чарзе.

І вось з такога «багацьця выбару» мы абралі трэці варыянт. І зрабілі адну памылку...

Я ня каюся, што схапіла камень ледзь ня самай першай. Мне проста сьмешна, што цэлыя паўгадзіны насіла яго з сабой. Шпурнуць — такі цяжар, мне, на такую адлегласьць?! Пакласьці на зямлю — адразу пачуцьцё безабароннасьці («бяззбройнасьці»). 30 тысячаў і 40 хвілінаў — дастаткова, каб меркаваньне пра нас рэзка зьмянілася.

Я ня каюся, што той камень

# ТРЫ ГАДЫ, ПРАЖЫТЫЯ Ў НЯНАВІСЬЦІ

Павал СЕВЯРЫНЕЦ

Падзеі 17 кастрычніка вострa нагадвалі Вясну-96 і Вясну-97.

Пра ўлады казаць бессэнсоўна: абсалютна ясны плян правакацыяў. Подласьць, подласьць і яшчэ раз подласьць. Але гаворка не пра іх — гаворка пра нас.

Справа не ў этычным аналізе. Каменны град і разгром натоўпу — гэта толькі непазьбежнае сьледзтва. Позна думаць аб інтэлігентнасьці, калі на цябе, як таран, нясецца зьверападобная махіна з гумавым дубіналам, а пад нагамі якраз апынуўся булыжнік. Позна. Чаму ў такое імгненьне застаецца розуму толькі на тое, каб мільгом прыкінуць, ці здольны ты будзеш патрапіць і зьбіць яго з ног, ці лепей усё-ж ірвануць без аглядкі?

Думаць пра тое, ці дапушчальна біць чалавека, хто б ён ні быў, ці дапушчальная нянавісьць і ці пераможа яна, трэ было нашмат раней. Пасьля Вясны-95 нам даваўся год, каб падумаць. Плявалі мы на такія раздумы — сьцяг наперавес, як штых, і ў атаку!.. Правалілі імпічмэнт, атрымалі разгон ВС і рэфэрэндум. Хрэн вам, казалі мы, сіла ёсьць, паглядзім вясною. А думаць... Навошта? Вясна-97, тыя ж саюзныя дамовы, тыя ж маніфэстацыі й сутыкненьні, такая ж чырвоная кроў. Вынік? Справы Шарамета, Шыдлоўскага-Лабковіча, Кабанчука. Падумайце ўсё-ткі, хлопцы. Бо мы зь нянавісьцю робімся такімі ж самымі, як яны.

Але што тут думаць — мы зьбярэм 100-тысячны марш і так шандарахнем па вашых кардонах, што... Што? Ну што? Што далей?!

Што, зь нянавісьцю? Зваліць Лукашэнку? Паказаць Расеі, што мы здольныя даць па зубах? Паказаць Захаду, што мы яшчэ жывыя?

Тры гады, пражытыя ў злосьці, са сьціснутымі, зьведзенымі да сутаргі зубамі, пасьля Вясны-96 нічога нам не далі. Толькі страты: Канстытуцыя-94, Вярхоўны Савет, Шарамет і Ступнікаў, Клімаў і Віньнікава, ідэя выбараў-99, ідэя 21 ліпеня, Захаранка і Ганчар... Згубілі й адзіны БНФ. Між іншым, і сёньняшні раздрай у Беларускім Народным Фронце называецца тым жа словам, што і пабоішча 17 кастрычніка. ГЭТА НЯНАВІСЬЦЬ. Гэта бязбожная нянавісьць да Лукашэнкі, да Масквы, да сваіх суайчыньнікаў, да сяброў па партыі, да тых, з кім мы нязгодныя. Нянавісьць, як асноўны інстынкт, вельмі прымітыўная й вельмі тупая, заўсёдная зброя слабых.

Хочаце быць слабымі? Хочаце мець Лукашэнку ў 2001-м і дэманстраваць у 2002, 2003, 2004-м?.. Хочаце застацца вечна прыніжанымі і, як збавеньня, чакаць карцінкі на НТВ? Ненавідзьце далей.

А зь мяне хопіць. Я ЛЮБЛЮ. Люблю сваю краіну і буду рабіць усё, каб яе палюбілі яшчэ тысячы маладых. Люблю Беларускі Народны Фронт, хачу бачыць яго адзіным і пастараюся гэтага дамагчыся. Люблю жыць для Беларусі, а не выбіраць паміж воляй і сьмерцю. Ёсьць выбар між воляй і страхам, вось гэта факт. Я ведаю, што трэба перавярнуць і перамяніць да лепшага горы грамадзтва, і што гэта можна й трэба рабіць зараз — бяз крыку адчаю, але зь любоўю. Я ўжо свабодны — свабодны ад нянавісьці.

Проста я веру ў Бога і ведаю — перамога даецца толькі зь любоўю. Беларусь будзе вольнай і незалежнай, толькі займайцеся ёю, а не лукашэнкам. Так, без надзеі ўбачыць рэальны вынік увечары ў тэленавінах, але з поўнай упэўненасьцю, што праз тры гады не давядзецца паўтараць усё ізноў. Калі мы не ўразумеем гэтага і цяпер — што ж, чакайце чарговага іспыту.

Ня будзьце слабымі, сябры. Стойце ў Свабодзе, якую даў вам Хрыстос. Свабода ня мае нянавісьці. ■

# АДРАДЖЭНЬНЕ Й РЭВАЛЮЦЫЯ

***Цэнтральная Рада Маладога Фронту спрабавала прасіць прабачэньня ў міліцыянтаў за той каменны град, пад які ахоўнікі дзяржаўнага парадку трапілі 17 кастрычніка. Пасьля гэтае рашэньне дэзавуявалі — стала вядома пра зьверствы амонаўцаў у дачыненьні да арыштаваных, у гэты раз сапраўды, здаецца, проста жывёльныя. Ідэалізм адраджэнцаў увайшоў у супярэчнасьць з эмпірыкай рэвалюцыі.***

***Любыя такія сутыкненьні — гэта рэпэтыцыя нечага большага. Тактыка авангарду дэманстрантаў была вулічна правільнаю: шчыльны трайны кардон міліцэйскіх шчытоў прабіць ці выціснуць з моста было немагчыма. Прарваць яго можна было або ўжыўшы грубую сілу, чаго нікому не хацелася, або справакаваўшы частку міліцыянтаў на пагоню і кінуўшыся ва ўтвораныя тым самым "дзіркі": атрымалася б куламеса, але маса дэманстрантаў пры мінімуме гвалту пратачылася б на іншы бок Сьвіслачы, як вада скрозь сіта. Дэманстрацыю, як плынь, не стрымаць. Пагатоў, што міліцыя ўнутрана спачувае дэманстрантам. Іншая рэч, што недзе там, пад чырвоным домам, стаяла напагатове служба аховы прэзыдэнта і тыя, хто займаўся Захаранкам, Ганчаром і Віньнікаваю... Але дэманстрантаў заставалася мала, зусім мала для рашучых дзеяньняў. Жменька юнакоў, натхнёных сьветлай нацыянальнай воляй і маральнай сілай. Побач зь імі шпурлялі брук і проста людзі без ідэалаў, але з інстынктамі помсты і самазьберажэньня, якім пляваць на Беларусь, але якім перайшоў дарогу зьнянавідны Лукашэнка, пазбавіў жыцьцёвых пэрспэктываў. Гэты лукашэнка стаяў вось тут, са шчытом. Нянавісьць, кроў, мат, разбурэньне, натоўп, што разьбягаецца. Гэта абразіла адраджэнцаў. Не такой уяўлялі яны сабе рэвалюцыю, не пра такіх паўстанцаў чыталі яны ў кнігах пра Каліноўскага і Плятэр.***

***Гэтак адраджэнцы пачынаюць задумляцца над мэтаю свайго руху. Каго яны ўзгадавалі, каго абудзілі? Адраджэнцы-інтэлігенты. Адраджэнцы-стоікі. Яны хочуць узяць зацятасьцю, упартым стаяньнем, неаднаразовым паўтарэньнем шэсьцяў, цудамі духу, бясстрашным цярпеньнем удараў і зьдзекаў. А катарсыс аказваецца, на першы погляд, брудным і ўсякім. Адраджэньне гартуе ідэалы, ідэалы хочуць спраўдзіцца. А рэвалюцыянэры — байцы і апартуністы.***

***Ці мусова адраджэньне як падрыхтоўча-асьветніцкі чын скончыцца Нацыянальнай Рэвалюцыяй? І чым, калі ня ёю? У якую форму яна апранецца? Якая крытычная маса мусіць назапасіцца? Па чым пазнаюць рэвалюцыйную сытуацыю? Ці дастаткова пары нешматлікіх, але адданых і падрыхтаваных падпольных групаў, каб узначаліць 100-тысячныя шэсьці?***

***Культура — гэта рэзэрвацыя, у якую каляніяльныя ўлады хочуць загнаць нацыянальную энэргію. Спробы падмяніць палітычную і эканамічную барацьбу культурніцтвам — гэта прапановы капітуляцыі. Капітуляцыі шчэ перад боем. Прычым штодзённую палітычную барацьбу прапануецца замяніць не інтэлектуальным пошукам і мастацкай творчасьцю, а дзевятнаставечным, народніцкім, сьвіткавым асьветніцтвам, папулярызацыяй — агітацыяй за шчасьце.***

***Рэвалюцыя толькі тады бывае аксамітнаю, калі яна адбываецца з пазыцыі бясспрэчнай сілы, нават калі гэта культурная рэвалюцыя.***

**Андрэй Дынько**

## Сьведчаньні пацярпелых

...Дэманстранты папаўзьлі назад ад кардонаў АМОНу, міліцыянты даганялі людзей і выхоплівалі з натоўпу, валілі на зямлю. У адказ паляцеў град камянёў. Што было далей...

...Спэцназаўцы лавілі людзей, закідвалі ў заштораныя аўтобусы...

**Мікалай Ганчар**: *«Я быў унізе, калі на нас пачалі скакаць амонаўцы. Такім чынам я не атрымоўваў удараў абцасамі па сьпіне, як тыя, хто ляжаў зьверху, але затое задыхаўся ад сьцісканьня грудной клеткі».*

**Натальля Маковік** з «Маладога Фронту»: *«Пры ўваходзе ў нейкі аўтобус усе праходзілі «апрацоўку». Стаўлялі «на расьцяжку» ды білі па нырках, пячонцы, па рэбрах, па галаве. І так кожнага, аднаго за адным... Што рабілі ў аўтобусе, я ня бачыла, але стуль даносіліся жудасныя крыкі. У аддзеле афіцэр, да якога мяне прывялі на допыт, сказаў, што хоча мяне, хоча са мною пераспаць. А ў абмен даруе мне свабоду. Я сказала, што лепш сяду ў турму».*

Супрацоўніцы газэты «Навінкі» **Насьце Неказанавай** спачатку прапанавалі агаліцца і «паказаць фігурку», а калі яна адмовілася, разьбілі лоб. На пагрозы паскардзіцца міністру ўнутраных справаў Сівакову гучаў толькі адзін адказ: «Нам Сиваков никто, у нас один хозяин — Лукашенко».

**Уладзімер Чарноў** выйшаў пасьля трох сутак арышту: *"У праходзе аўтобуса ўсіх звалілі аднаго на аднаго і наверх закінулі дзьвюх жанчынаў. У той самы час працягвалі біць па галовах. Плявалі. Спрабавалі мачыцца. Калі ўнізе пачалі задыхацца, яны пачалі крычаць, што вывезуць усіх у лес і закапаюць. Пакуль аўтобус ішоў, яны прымушалі жанчын, якія плакалі, гучна сьпяваць: "В траве сидел кузнечик". Скакалі на тых, што ляжалі ў праходзе. Пасьля ўдару па галаве я на час страціў прытомнасьць. Тады мяне выцягнулі і двое ламалі рукі, а трэці піхаў і пракручваў у глотцы гумовую дубінку».*

«Аўтобусы сьмерці» калясілі па горадзе паўтары гадзіны. Наўмысна, каб болей было пакутаў.

Калі ўжо прыехалі, адзін з амонаўцаў стаў пры выхадзе зь яшчэ аднаго такога аўтобуса ды ўсіх, хто выходзіў, біў у сьпіну дзьвюма нагамі, павісаючы на парэнчах, ад чаго людзі выпадалі з аўтобуса тварам на зямлю.

Уладзімер Чарноў напісаў адкрыты ліст міністру ўнутраных справаў Юрыю Сівакову. Пад лістом паставілі подпісы 60 зьбітых.

Старшыня праваабарончага цэнтру «Прававая дапамога насельніцтву» Алег Воўчак заявіў, што ідзе збор заяваў ад пацярпелых, якія накіроўваюцца ў пракуратуру. Дзеяньні амонаўцаў падпадаюць пад артыкул 167 КК РБ «Перавышэньне паўнамоцтваў» (да 10 гадоў зьняволеньня). 11 чалавек ужо напісалі такія заявы. «Яны мусяць адказаць паводле закону», — кажуць гэтыя людзі.

20 зьбітых зьвярнуліся да гарадзкога пракурора Мікалая Купрыянава з просьбай узбудзіць крымінальныя справы ў дачыненьні да супрацоўнікаў АМОНу, якія пасьля акцыі ўжывалі да затрыманых мэтады катаваньня.

**Аляксей Шыдлоўскі**

**Сьпіс затрыманых і асуджаных пасьля «Маршу Свабоды» 17 кастрычніка**

| | |
|---|---|
| Гразнова Людміла | 300 млн. р. |
| Якімовіч Сяргей | 50 млн. р. |
| Савіцкі Павал | 30 млн. р. |
| Чарняўскі Сяргей | 30 млн. р. |
| Капярыха Павал | 30 млн. р. |
| Лужко Аляксей | 29 млн. р. |
| Касьпяровіч Алег | 29 млн. р. |
| Муля Юры | 29 млн. р. |
| Канапелька Сяргей | 29 млн. р. |
| Абрамовіч Марына | 29 млн. р. |
| Камароўскі Аляксей | 29 млн. р. |
| Мармыш Сяргей | 29 млн. р. |
| Лаўрэцкая Валянціна | 29 млн. р. |
| Капарыха Зьміцер | 29 млн. р. |
| Ганчар Мікола | 25 млн. р. |
| Грынкевіч ? | 25 млн. р. |
| Каралёў Станіслаў | 35 млн. р. |
| Маковік Натальля | 35 млн. р. |
| Афнагель Яўген | 15 сутак |
| Сьліжнік Уладзімер | 15 сутак |
| Гюнтэр Барыс | 15 сутак |
| Лугін Яўген | 10 сутак |
| Кірылёнак Павал | 10 сутак |
| Ярашэўскі ? | 7 сутак |
| Чэркас Алег | 7 сутак |
| Пражнікаў В.Н. | 5 сутак |
| Бабарыка Сяргей | 5 сутак |
| Іванова Зоя | 5 сутак |
| Туркоў ? | 5 сутак |
| Шчурко Аляксей | 5 сутак |
| Лазоўскі Міраслаў | 5 сутак |
| Жук Вячаслаў | 5 сутак |
| Гормаш Павал | 5 сутак |
| Назараў Аляксей | 5 сутак |
| Глускоў Кірыл | 5 сутак |
| Яфрэменка ? | 3 сутак |
| Чарноў Уладзімер | 3 сутак |
| Лябедзька Анатоль | 10 сутак |
| Алешнікава Алена | 3 сутак |
| Бар'ялай Вольга | 3 сутак |
| Кошчанка Ўладзімер | 3 сутак |
| Нікіцін Алесь | 3 сутак |
| Анціпенка Алесь | 3 сутак |
| Радзімоўскі Юры | 3 сутак |
| Пыркін Павал | 3 сутак |
| Мятліцкі Мікола | 3 сутак |
| Музычын Сяргей | 3 сутак |
| Кручынік Аляксандар | 3 сутак |
| Осаў ? | 3 сутак |
| Зьвернік ? | 3 сутак |
| Алексахін Уладзімер | 3 сутак |
| Більдзюк Аляксей | 3 сутак |
| Шэлістовіч Аляксей | 3 сутак |
| Санковіч ? | 3 сутак |
| Віняўскі Макс | 3 сутак |
| Герасімовіч Надзея | 3 сутак |

*Сьпіс няпоўны*

**Сьпіс палітвязьняў, якія знаходзяцца пад вартай па крымінальных справах:**

Андрэй Клімаў
Уладзімер Кудзінаў
Васіль Лявонаў
Васіль Старавойтаў
Міхаіл Чыгір

**а таксама арыштаваныя па крымінальных артыкулах пасьля 17 кастрычніка:**
Андрэй Валабуеў (выпушчаны пад падпіску)
Глеб Догель
Мікола Статкевіч
Герман Сушкевіч
Валеры Шчукін

**пад падпіскай аб нявыезьдзе, крымінальныя справы:**
Уладзь Антонаў
Яўген Асінскі
Алег Волчак
Вера Страмкоўская

**асуджаныя ўмоўна (тэрмін ідзе):**
Яўген Мурашка
Яўген Скочка

*Пры дапамозе БХК і ПЦ «Вясна-96» падрыхтаваў А.Ш.*

урэшце кінула. Натуральна, ён не даляцеў, хоць амонаўскі шыхт рвануў на нас, і я, зазяваўшыся, засталася перад ім ледзь ня сам-насам. Камень упаў пад ногі мянтам і няхай на пару сэкундаў, але спыніў шыхт. Гэтага хапіла, каб уцячы мне й яшчэ камусьці. Ці ня той самы камень прасьвісьцеў пад час тых уцёкаў каля маёй галавы? Я дык проста аслупянела, калі ўбачыла, зь якім выразам твару амонаўцы камяні падбіраюць і кідаюць: такое шчасьце, такі азарт!

Улада зь ейным карным апаратам нам у гэтым імкнецца дапамагчы штодня, ёй гэта ўдалося, нарэшце, 17-га. А вось нашая «трэніраванасьць» — для мяне навіна, спадарове. Прафэсійны вулічны баявік мусіў думаць пра першы шэраг. Першы шэраг шчытоў — хлопчыкі ў вайсковай форме — мусіў быць адсунуты ўбок. Патрапляючы на службу ва ўнутраныя войскі, яны мелі меней «выбару», чым мы з вамі 17-га. Калі б у мяне быў сын, ён быў бы ці ў войску, ці сярод дэманстрантаў, але ён ня быў бы ў амоне. Я згодная, што «усе людзі — браты», але не магу зразумець: як мой брат можа атрымліваць грошы, працуючы ў гестапа?

Строга кажучы, ня мне вырашаць, прасіць ці не прасіць прабачэньня. Давайце спытаем пра гэты тых, хто пацярпеў: трапіў у шпіталь з расьсечанай галавой, быў таптаны амонаўскімі ботамі, біты па нырках, здушаны, запляваны, зьнявечаны. Давайце апынемся на іхным месцы — а потым возьмем на сябе ролю справядлівых судзьдзяў!

Наша віна толькі ў тым, што мы не «трэніраваныя баевікі», а таму дзейнічаем ня розумам, а эмоцыямі.

Не прасіце прабачэньня ў злачынцаў! Папрасіце ў Бога, каб даў сілы разам перамагчы зло. ■

ЗНАКАМ ТЫМ

# «ЧАС ЗЬБІРАЦЬ КАМЯНІ»

Вольга КАРАТКЕВІЧ

Не камяні, якімі маладыя ўдзельнікі Маршу Свабоды прабівалі шлях да Волі і якія пасьля ляцелі ў сьпіну гэтым удзельнікам з боку міліцыянтаў, а вобраз каменя — сымбалю сьпеласьці і мудрасьці — узгадаў Лявон Вольскі ў сваёй песьні «Я, да жалю, ня пан». У сучаснай Беларусі мы зьбіраем камяні — першую зброю саракатысячагадовага Homo Sapiens.

«Мне лягчэй на душы, калі мой муж — у турме. Я ведаю, што ён жывы", — сказала жонка Анатоля Лябедзькі, асуджанага на 10 сутак адміністрацыйнага арышту. 17 кастрычніка дэпутат Вярхоўнага Савету Анатоль Лябедзька пасьпеў першы выступіць на мітынгу, перадаць прывітаньне ад міжнароднай грамадзкасьці мужным беларускім дэмакратам і папярэдзіць апошніх аб магчымых правакацыях. Пасьля Лябедзька паехаў дадому. У аўторак быў затрыманы. У сераду асуджаны. Прысуду судзьдзі Савецкага раёну Казадаева мы чакалі больш за гадзіну... Пасьля вынясеньня прысуду Лябедзька заўважыў: "Там — ня зьнішчаць". Мабільны дыплямат з АБСЭ на пытаньне, што ён пра гэта ўсё думае, адказаў: «Вы ведаеце». Правільна, думае і адчувае ўсё тое, што й мы. Нармальныя мужчыны служаць жанчыне і Радзіме, а ня ідалу.

Аляксандар Лукашэнка, які прафэсійна гуляе ў вэрбальныя гульні, спадзяваўся і надалей мусоліць "перамовы". Ён адчувае сябе камфортна і ўпэўнена: гульцы вядомыя і прадказальныя, гульня адбываецца на ўласным полі, міжнародныя арбітры пазбаўленыя эмоцыяў. Аляксандар Лукашэнка аказаўся непадрыхтаваны да дыялёгу сілай. Паказальная працяглая адсутнасьць рэакцыі сп. Лукашэнкі на падзеі, шырока пракамэнтараваныя замежжам. Напрыканцы тыдня нават дэпутаты малдоўскага парлямэнту далучыліся да асуджэньня дзеяньняў беларускіх уладаў, а эпатажная Валерыя Навадворская паабяцала баранiць незалежнасьць Беларусі са зброяю ў руках і нат пазнаёміла расейскага тэлегледача з Багдановічавай "Пагоняй".

Затрыманыя пасьля Маршу Свабоды сталі вязьнямі сумленьня, а міліцыянты, якія біліся зь непаўналетнімі дэманстрантамі, атрымалі дзяржаўныя ўзнагароды. Тут узгадаліся радкі Робэрта Раждзественскага, што зьмешчаныя на інфармацыйным стэндзе ў Партызанскім РАУСе сталіцы. Савецкі паэт зьвяртаецца да кожнага міліцыянта і нагадвае нешта накшалт "по нему одному судят о законе всей страны". Адзін такі й сказаў мне ў РАУСе, што "калі б зараз загадалі, застрэліў бы".

Кожны факт з кронікі фізычнай і маральнай расправы над затрыманымі пасьля Маршу Свабоды — небанальная ілюстрацыя, гаварыць пра якую выпадае толькі пасьля працяглага асэнсаваньня. Твор нечалавечага «мастацтва», успрымаць які нармальная псыхіка адмаўляецца. Істоты, якія ў цемры аўтобусаў тапталіся па сьпінах людзей, утварэньні, якія піналі, зьневажалі, абплёўвалі і білі людзей, суб'екты, якія прымушалі людзей сьпяваць «В траве сідел кузьнечік», а маці траіх дзяцей абяцалі згвалціць зграяй — відаць, гэтыя арганізмы прайшлі сэлекцыю перад тым, як уладзіцца ў Орган, ваяўнічасьць якога спароджаная адно інстынктамі. А розуму цяжка весьці дыялёг з інстынктам, таму часам асэнсаваным шляхам для аргумэнтацыі ў людзей разумных ёсьць інстынктыўны шлях. "Час зьбіраць камяні, час расьці камяням". ■

каляндар

# 100 гадоў таму

**1899 год. На схіле стагодзьдзе, якое менскі філёзаф Францішак Эн назваў «бяздомным»: «Беларуская гісторыя XIX стагодзьдзя — гэта гісторыя бяздомнасьці. Усе стваральныя памкненьні, усе спробы выбудаваць пэўны кшталт жыцьця й культуры сканчаюцца нічым. Здаецца, усё жыцьцё пішацца на абрыўках судовых вырокаў ды няўцямна-афіцыёзных цыркулярах каляняльнае адміністрацыі»...**

**Атмасфэра стогадовае даўніны... Расейцы замацавалі «саюз Беларусі і Расеі» праз татальную «зачыстку» нашых земляў. Паўстанцы Каліноўскага — хто ў Парыжы, хто ў Сібіры... Наезд расейскіх чыноўнікаў да нас можна параўнаць хіба з татарскім нашэсьцем.**

**Канец XIX стагодзьдзя ў Беларусі пазначаны агульным для Расейскае імпэрыі «сьвербам» сацыялістаў-народнікаў. Любы падручнік-даведнік выдасьць вам цэлы стос «сацыяльна-рэвалюцыйных» ініцыятываў... Год, як у Менску абвясьцілі сябе РСДРПэўцы... У 1899-м на Гарадзенскай тытунёвай фабрыцы Шарашэўскага — страйк... У памесьці Блонь гаспадары-памешчыкі заснавалі сярод сваіх сялянаў народніцкую арганізацыю. Праз два гады іх «накрыла» паліцыя... Актывізуюцца «Бундаўцы»... Адным словам: «Бура, хутка грымне бура»...**

**Археоляг Вандалін Шушкевіч выдаў зборнік «Каменныя курганы ў Лідзкім павеце». Этнограф і фальклярыст Мікола Нікіфароўскі заканчвае працу над васьмітомнікам «Нарысы віцебскае Беларусі», распачатую ў 1892 годзе...**

**Нарадзіўся Хорхе Луіс Борхес (1899—1986).**

**Нарадзіўся Ясунары Кавабата (1899—1972).**

**...Час беларускіх «бяздомных інтэлектуалаў».**

**За год да сваёй сьмерці Францішак Багушэвіч рыхтуе да друку «Беларускія апавяданьні Бурачка». Першымі і апошнімі чытачамі зборніка былі царскія цэнзары. Але слова «Беларусь» ужо прамоўленае. «Сапраўдны «аўтар» гэтага знаку — Францішак Багушэвіч. Яго падхапілі «хлапцы», якія празь сем гадоў пачнуць выданьне «Нашае Нівы»...**

**Да першай сусьветнай застаецца пятнаццаць гадоў, да абвяшчэньня БНР — дзевятнаццаць.**

**Севярын Квяткоўскі**

*Фота пачатку XX ст.*

*Здымкі з архіву Міколы Купавы.*

# 30 ГАДОЎ ТРАГЕДЫІ

***Апісаньне жыцьця й зьнішчэньня бажніцы Апекі Маці Божае ў Воршы***

Мікола КУПАВА, мастак

На працягу жніўня—кастрычніка 1969 году быў зьнішчаны адзін з найлепшых помнікаў беларускага барока, найбуйнейшая сьвятыня Воршы — сабор Апекі Маці Божае колішняга кляштару базыльянаў. Гэтая велічная бажніца два стагодзьдзі вызначала аблічча старажытнага гораду над Дняпром.

У 1758 годзе з ініцыятывы й на фундуш аршанскага старосты Івана Лянкоўскага пачалося ўзьвядзеньне базыльянскага кляштару са сьвятыняю. Будаўніцтву папярэднічала вялікая праца над стварэньнем архітэктурнага праекту, набыцьцём і дастаўкай будаўнічых матэрыялаў. Вымуроўка рабілася з адмыслова выштукаванай чырвонай цэглы. Сам Іван Лянкоўскі прыгледзеў і прыдбаў пад будаўніцтва маляўнічы куток зямлі на пагорку, што на правым беразе рэчкі Аршыцы. Гэтае месца беспасярэдне прылягае да старадаўняга гістарычнага цэнтру. З эстэтычнага й горадабудаўнічага пунктаў гледжаньня выбар месца пад забудову быў беспамылковы. Час гэта пацьвердзіў...



*Фота 1969 году*

Комплекс уніяцкага кляштару з бажніцаю сеў блізка астатніх манумэнтальных збудаваньняў Воршы, злучыўшыся зь імі ў адзіны непаўторны ансамбаль. І гэта было апошняй рысаю ў фармаваньні гістарычнага гарадзкога асяродку: у паўднёвым Задняпроўі паўстаў комплекс Куцейнаўскіх праваслаўных манастыроў, на паўночным захадзе — наш, той самы, Базыльянскі кляштар. Будаўніцтва было канчаткова завершанае ў 1774 годзе, калі й адбылося высьвячэньне сабору пад назовам Апекі Маці Божае. Гэта было ўжо праз два гады пасьля акупацыі нашага Падняпроўя Расеяй. І ў гэтыя два апошнія гады імпэтна вялася праца па аздабленьні самое бажніцы.

Кляштарны будынак мае галерэйную сыстэму плянiроўкі, колісь ён быў перакрыты высокай вальмавай страхою з дахоўкі. У сутарэньнях і на першым паверсе — крыжовыя скляпеньні, вышэй — бэлечныя перакрыцьці. Фасады аздобленыя пілястрамі, руставанымі цягамі й філёнкамі. Гэты будынак ацалеў, на шчасьце, да нашых дзён.

Велічны гмах трохнэфнае кляштарнае базылікі зь дзьвюхвежавым фасадам быў збудаваны ў стылі позьняга, *віленскага* барока. Стромкія, сьветлыя вежы сьвятыні і вялікі купал над сяродкрыжам, якія былі бачныя з розных канцоў места, трымалі на сабе ўвесь архітэктурны вобраз Воршы і надавалі яму велічны і ўрачысты характар. Асаблівa прыгожа выглядаў гэты сабор з боку Аршыцы, у водах якое адлюстроўваўся ягоны абрыс... І я гэта добра памятаю з часоў свайго маленства. Вобраз храму адлюстроўваўся і ў маёй душы. Ён для мяне стаў узорам хараства і ўсьведамленьня вечнасьці... Маё дзяцінства мінала тут побач, на тым самым беразе Аршанкі. І прысутнасьць бажніцы адчувалася мною ўвесь час. Менавіта ў засені бажніцы Апекі Маці Божае сфармаваліся мае духоўныя й мастакоўскія пачуцьці...

Па вайне царква доўга стаяла бяз даху і купалоў, уяўляючы сабою суворае, але рамантычнае відовішча. І гэткі стан сьвятыні цалкам адпавядаў тагачаснаму стану беларускай культуры наагул: парушанай, зьнявечанай, але яшчэ жывой і прывабнай. Дарэчы, у міжваенны час тут нават дзейнічаў нейкі музэй...

...Як па касаваньні Уніі ў 1839 годзе ў Воршы зьвялі грэка-каталіцкую царкву, дык і гэты базыльянскі сабор стаў праваслаўным. Як і ўсе колішнія каталіцкія і ўніяцкія бажніцы Воршы. У 60-я й 80-я гады мінулага стагодзьдзя й на пачатку нашага сабор Апекі Божае Маці колькі разоў пераробілялі на новы, расейскі капыл. З таго часу ён страціў свой першародны, спрадвечны вобраз. Пры ім дзеялі праваслаўныя вучэльня й манастыр.

...Па вайне, за часоў майго дзяцінства, гэтая сьвятыня, занядбаная й пашкоджаная, нікому не была патрэбнаю. Але для беларускай культуры, для нашае гістарычнае спадчыны надышлі самыя чорныя, трагічныя часы. Па ўсім краі руйнавалася нацыянальная спадчына. Гэткі чорны дзень надышоў і для сабору Апекі Маці Божае — у жніўні 1969 году.

Я прыехаў тады ў Воршу да сваіх бацькоў, у першы свой адпачынак пасьля году працы ў Менску. Тады й адбылася тая жахлівая сустрэча... На мяне зеўрыла нутро бажніцы, у якой не было ўжо правага нэфу й вежы. Я стаў і заплакаў... Гэтак я ўпершыню пабачыў сьвятыню знутры... і быў уражаны яе дасканалым канаючым хараством. Гэта была казачная птушка. Яна маўкліва паміралa, ператвараючыся ў пыл ды парахню. А побач увіхаліся йстоты з мізэрнымі душамі, якія ўсё меpалі на пляшку гарэлкі. І ў іх была чыгунная баба, якая нястомна, дзень пры дні рабіла сваю справу.

Я пасьпеў тады зрабіць вось гэтыя здымкі. І паехаў у Менск, мяркуючы, што ў сталіцы можна будзе прыняць якія дзейсныя захады дзеля ўратаваньня сьвятыні. Адразу ж напісаў ліст у тыднёвік «ЛіМ», у Таварыства аховы помнікаў і Савет міністраў, наіўна мяркуючы, што калі не чынавенства зразумее, дык хоць «ЛіМ» надрукуе мой допіс, поўны болю й роспачы... Але ж не! Ніхто мне нават не адказаў. Тое самае ў той жа час спрабаваў рабіць і Ўладзімер Караткевіч. Але ўсё было марным. Сьвятыня была зьнішчаная дазваньня чыгуннай бабаю, а друз вывезьлі зь месца злачынства. Ад бажніцы да восені застаўся толькі аскабалак вежы левага нэфу, з таго боку, дзе яна прымыкала да кляштару. Вось і ўсё, што засталося ад славутага нашага помніка...

Яшчэ раней я бачыў тое самае ў сваёй Воршы, калі ў 1958 годзе зьнішчалі іншы сабор Нараджэньня Багародзіцы, канца XVII стагодзьдзя. Таксама чыгуннай бабаю. Я тады вучыўся ў школе. І напярэдадні тае падзеі зрабіў пару замалёвак бажніцы ў свой альбом... На жаль, ён не зьбярогся. Але я зьбярог памяць пра тое хараство.

Цяпер новыя часы. Гэта ўжо ня тыя далёкія 58-ы ці 69-ы гады. Перакананы, што ўжо сёньня мы можам, абавязаныя ставіць пытаньне пра аднаўленьне сваіх сьвятыняў. Нехай жа стане знакам Адраджэньня Воршы ўзнаўленьне найперш сабору Апекі Маці Божае. Прыйдзі! І будзь з намі вечна! ■



*Фота 1968 году*



Фота Міхала Баразны

## Андрэй АЛЯКСАНДРАЎ

* * *

Сталь зноў знаходзіць сталь,
Боль зноў знаходзіць боль.
Сьлёзаў тваіх крышталь
Выпіць ты мне дазволь.
Сьлёзы знаходзяць сьмех,
Вечар знаходзіць дзень.
Сьвятасьць шапне пра грэх,
Сонца схавае цень.
Стужкай — няспынны шлях.
Рушу — за крокам крок.
Горад — за гмахам гмах —
Моўчкі схавае змрок.

* * *

Я ўваходжу ў твой вечар
дажджысты
звонку
ціхімі крокамі,
каб не служаць
яго
неасьцярожным рухам,
гучным словам,
каб не парэзаць
ягоны танклявы шоўк
вастрынёй цікаўнага позірку,
не парушыць каб
ягоную мяккую цішыню
і гармонію — мітусьнёю.
Уваходжу павольна,
ледзь кранаючыся нагамі падлогі,
пакрыху ўдыхаю
вытанчаны водар
твайго вечару,
што пахне
тваімі марамі
пра вечнае сонца,
бліскучае імгненьне якога
ўзыйдзе
над тваім вечарам,
калі зь яго сыйду
я.

## Алесь АРКУШ

ЛЕГАЛІЗАЦЫЯ

Спачатку паэт пайшоў у гарвыканкам,
каб папрасіць дазволу называцца паэтам;
затым пайшоў у аддзел унутраных спраў,
каб атрымаць пасьведчаньне паэта;
затым пайшоў у пашпартны стол,
каб зарэгістраваць сваё пасьведчаньне;
затым пайшоў у падатковую інспэкцыю,
каб напісаць заяву, што ня будзе
займацца камэрцыйнай дзейнасьцю;
затым пайшоў у гарана,
каб давесьці, што ягоныя вершы
ня будуць шкоднымі для вучняў школ;
затым пайшоў у гаргаз,
каб запэўніць, што ягоная творчасьць
не самаўзгараецца;
затым пайшоў у цэнтар занятасьці,
каб даведацца, ці ёсьць якое
вольнае працоўнае месца,
бо і паэтам трэба есьці;
затым пайшоў у жыльлёва-камунальную
службу
пацікавіцца, ці можна атрымаць
які-кольвечы пакойчык пад жытло;
затым зноў пайшоў у гарвыканкам,
каб папрасіць дазволу надрукаваць сваю
кнігу;
затым пайшоў...

МУДРОЎ

Ён наламаў нямала дроў.
Вінцэсь па прозьвішчы Мудроў.
Сьвяціў «Блакітным ліхтаром»,
Як дысыдэнт грашыў пяром.
Падпольны «Ксэракс Беларускі»
Быў для яго задужа вузкім.
Пасьля ён браўся за «Калосьсе»,
Бо не любіў цэнзуры восьці.
Руку паклаўшы на каран,
Пісаў аповед пра таран.
Быў піянэрам, шахматыстам,
Стылягам, прэсай, альбаністам.

ДРУКАРКА

Як кулямёт, зараджана друкарка,
Мігцяць агеньчыкі — да бою пяць хвілін.
І скачуць літары па белым полі шпарка,
Штурхаючы у кроў адрэналін.

## Ярына БЕРАСЬЦЕЙСКАЯ

МАЦІ

Я зноўку тут,
Ты зноў ня сьпіш,
І за фіранкай белы крыж.
Ліецца ціхае сьвятло,
Дзяцінства быццам не было.
Наш дом, драўляны шэры дах,
Нізенькі плот і бэзу пах.
А час адлічвае гады...
Я зноў вяртаюся сюды.

## Марта ГАМАНОВІЧ

***

Ня кліч у замежжа, браток-галубок.
Баюся чужога, бо скінула ўрок,
Што з гэтай зямлі ўдалечынь пацягнуў,
А сьвет незнаёмы ледзь не праглынуў.
Вярнулася птушкай, пачуўшы вясну,
На хатнішча з зарасьнікам палыну —
Няма мне прытулку. Вясна адцьвіла,
Ды мары яшчэ не згарэлі датла.
І кожнаю думкай, дыханьнем і сном
Змагаюся з шызым, гаркім палыном...
Зьлятай, паглядзі, ды вяртайся хутчэй,
Бо моташна жыць мне бязь любых вачэй.

## Аляксандар КАЧАНАЎ

* * *

Ад пяшчоты замоў
Прытулюся шчакою да дрэва.
Ў абыякавы сьвет
Алускаецца подых быццця.
Бачу твой сылюэт.
І сьпякота жаночага цела
Зноў і зноў абуджае мяне
Да спакусы жыцьця.

## Уладзімер КОБЕЦ

ЭДЭЛЬВЭЙС

Як толькі веснавым раскатам гром
Адчыніць взны сьнежных стодаў,
Па скалах гор пальецца п'яны ром,
Жаданьнем наталяючы пароду.
Тады, між лінз рэліктавага лёду,
Вышэй усіх аблокавых завес
Свае пялёсткі, што крыштэлкі мёду,
Як Фэнікс, зноў раскрые эдэльвэйс.
Ён выбраў лес — ён мог расьці ў даліне,
Дзе цёпла і дзе тлусты чарназём.
Ён выбраў экстрэмальную вяршыню
І толькі ён яе каштуе ром.
Унізе — сонца бэсьціць сьлёкай травы,
Брыняе сокам будучы кампост,
А тут — мусон сьпявае сьмерці сагу
І б'ецца роспачна ў велічны фарпост.
І лашчыць холадам празрыстыя пялёсткі
І з-пад карэньняў вырывае жвір.
У эдэльвэйса век такі кароткі
І прагне ён вясны прысьпешыць пір.
Бо ён кахае сьнежную вяршыню,
Дзявочы дасканалы сілуэт.
Пад купалам нябеснае апсіды
Яны — жыцьця і сьмерці манумэнт.

Ён будзе гаварыць ёй пра каханьне
І да раньня складаць начны санэт
Пра сокаў неадольнае жаданьне,
Пра першага граху зямны ранэт.
Так, ён — фантом, ён — сполах у
Сусьвеце,
У белым взлюме яго закрые сьнег.
Магілай, самай пекнаю у сьвеце,
Нэкропалем нязьдзейсьненых надзей.
Так, зрэшты, мы цяпер з табою
Вясны глыбінны спасьцігаем сэнс,
Ты — экстрэмальная мая вяршыня,
Я — твой апошні эдэльвэйс.

ЭВАЛЮЦЫЯ

*Сэру Чарльзу Дарвіну прысьвячаецца*

Соладка сьпіцца ў норцы
Сусьліку ды вавёрцы,
Толькі ня сьпяць мужчыны,
Мужчыны шукаюць прыгодаў.
Блакітных шукаюць геі,
А гетэрасэксуалы
Шукаюць не лесьбіянак,
А гэткіх жа натуралак.
Потым яны знойдуцца
І возьмуцца, як ігуаны,
Швэндацца па сутоньнях,
Скляпеньнях ды завугольлях.
Бачыў бы гэта Дарвін,
Ён бы тады ня езьдзіў
На тыя Галапагосы,
Ён бы зьмяніў на шышкі
Тамашнія какосы.
Ён вывучаў бы лоўка
Норавы Камароўкі
І разнастайнасьць відаў
Менскае «стомэтроўкі».

## КРЫВІЧ

АБРЫСЫ

Няхай паўсюль тупыя пысы —
Я бачу іншыя абрысы:
Замест нікчэмных бульбашоў
Я мужных бачу ліцьвіноў.
Замест франтоўскіх ідыётаў
я бачу шчырых патрыётаў,
замест нянавісьці — любоў,
замест сабакаў злых — ваўкоў,
замест амбіцыяў — адданасьць,
замест разьліку — апантанасьць.
Няхай паўсюль тупыя пысы —
Я бачу вольнасьці абрысы.

ГОЛЫ

Хоць і ўпёрты, хоць і ўпарты
Наш герой, ды ён — кароль.
Ходзіць голы і бяз варты
Гэтай восеньскай парой.
Называе ён любога
Шпегам, агентам Масквы,
Любіць, кажуць, вельмі бога,
ды ня любіць ён Літвы.
Разгуляўся ў мнагадумнай
Галаве яго скразьняк.
Хто ж ён, гэты надта шумны?
Сябра НАТА — .... .

## НЕВЯДОМЫ

(сатыра)

ТАВАРЫШ БАЕЦ

Вазьмі памідораў, сарві агурэц,
Ня бі мяне моцна, таварыш баец.
Гумоваю палкай па нырцы ня бі,
А лепей у полі на хлеб зарабі.
Ты хату пакінуў, пайшоў у АМОН.
Таму што ў школе лавіў ты варон.
Каму сёньня служыш, пунсовы бэрэт,
За матчыну мову нам ломіш хрыбет.
Алошнім ударам, што нырку адбіў,
Ты лычку займеў і мядаль начапіў.
Мне першую нырку Чарнобыль згнаіў,
Калі рускі невук пажар запаліў.
Ня слухай зімоўскіх, ня слухай папоў,
Што дураць Краіну, што душаць братоў.
Вазьмі лусту хлеба, вазьмі селядзец,
Ты сёньня ня еўшы, вясковы хлапец.

## Браніслаў ПЯТКЕВІЧ

ПРЫЗВАНЬНЕ

Прызначэньне для мужчыны
і аснова ўсіх законаў —
Цеплынёю быць пры леце,
Наліваць жывым калосьсе,
Быць апораю кабеце,
Каб утульна ёй жылося,
Крочыць простай каляінай
Без калдобін і заганаў,
Не зважаць на дрэнь і зьвягі,
Весьці працу для карысьці,
Каб магчы зь нядолі выйсьці.
І тады жыцьцё наладзім,
Пра якое вечна марым.
Раніцой на даляглядзе
Зь цемрай зьнікнуць страх і хмары.

## Віталь СТАХІЕВІЧ

МАЛІТВА

Божа ўсемагутны! Зьлітуйся над намі!
Не пазбаў любові Маці-Беларусь.
Дабраслаў на волю, гнаную вякамі,
Паважаць Айчыну наш народ прымусь.
Не губі надзею нашу на збавеньне
Ад чужых уладаў, ад чужой крыві,
Дай сьвятое жарсьці ў справе адраджэнь-
ня
Нашага парадку на сваёй зямлі.
Не адбаў натхненьня ў стваральнай
працы,
ў творчасьці, у думках пра ўсё сваё.
Божа ўсемагутны! Дай нам ачуняці,
Дай нам моцы скінуць злое насланьнё!

## Тацяна ХМАРА

* * *

Я вярнуся да цябе праз сотні год,
Як дажджы заўжды вяртаюцца у мора.
Калі ўсё тваё жыцьцё напоўніць гора,
Я вярнуся да цябе праз сотні год.
Калі ты зусім сагнесься ад турбот,
З непарушнаю і сьцішанай пакорай
Я вярнуся да цябе праз сотні год,
Як дажджы заўжды вяртаюцца у мора.

* * *

Раскажы мне, калі ласка,
Дзе жыцьцё хавае казкі.
Пад якой жыцьця навалай
Я надзею пахавала.
Пахавала — не ўваскрэсьне,
Запяю жалобы песьню.
Намалюю фарбай белай,
Што чакаю, у што веру.
Сваю казку намалюю
І пушчу ў сьвет малую.
Раскажы мне, калі ласка,
Дзе жыцьцё хавае казкі.

### літаратурны сэмінар «Варштаты»

**А.Волкавай.** *З дасланых Вамі радкоў можна пакінуць для друку хіба вось гэтыя: Усё вакол засьнежыла зіма, Прыйшла сюды чароўнай гаспадыняю Халодны вецер-сівер прынясла, Заваражыла лес маўклівай стыняю. Над астатнімі трэба працаваць, не ляніцца дарабляць і перарабляць.*

**М.Гамановіч.** *У вершы «Ня вынесу болей ніякіх зваротаў...» ёсьць рытм і рыфма, але, на жаль, бракуе сэнсу. Хто да каго і зь якой нагоды зьвяртаецца?*

**Увага!** Шаноўныя «варштатаўцы», не дасылайце, калі ласка, тэксты, якія раней друкаваліся ў «Грамафоне». На кожным дасланым аркушы пішыце поўнасьцю імя і прозьвішча, стаўце дату.

С.А.

# Разьвітальная сустрэча

Што мяне занесла 20 кастрычніка на Кальварыйскія могілкі, дакладна не скажу. Напэўна, старыя арыстакратычныя могілкі — гэта лепшае месца для восеньскае дэпрэсіі. Шэры горад надзейна схаваны за двухсотгадовымі дрэвамі. Над навакольлем панує толькі касьцёл. Народу нікога. Толькі прозьвішчы на ацалелых крыжах. Але якія прозьвішчы! Неслухоўскія, Чачоты, Луцкевічы, Дамброўскія, Міцкевічы, Урублеўскія, Дамель. Савецкая эпоха не паспылася чапаць гэтыя магілы, і дзякуй Богу. Яны стаяць, нібы доказы таго, што тут была іншая Беларусь. Не падобная на тую, што ляскае тралейбусамі з-за дрэваў.

Блукаючы паміж крыжоў і склепаў ды цешачыся думкай, што, маўляў, некепска ляжаць у сузор'і такіх фаміліяў, я заўважыў на адным з узгоркаў цімалую працэсію. Я падышоў, калі людзі ўжо разыходзіліся. У працэсіі было шмат вядомых актораў, рэжысэраў. Немалую частку складала студэнцкая моладзь. Як высьветлілася, хавалі Ўладзімера Рудава, аўтара спэктаклю «Камэдыя». Якога я й сам меў гонар ведаць. І нават пасьпеў яму сказаць пару месяцаў таму, што ён паставіў вечны беларускі спэктакль. Той толькі пасьміхнуўся. Нестары яшчэ чалавек выглядаў так, як выглядаюць вельмі шчасьлівыя людзі. І раптам гэтая недарэчная магіла. Са свам філязофскім настроем я ніяк ня ўпісваўся ў жалобны мітынг. Людзі смуткавалі, мяне ж займала думка, ці гэта Бог дае чалавеку час зрабіць галоўную справу, ці гэта залежыць ад д'ябла? Зрэшты, Рудаў пасьпеў.

Кажуць, што нябожчык вельмі плённа выкладаў у Акадэміі Мастацтваў і Інстытуце Сучасных Ведаў. Што ён пісаў кніжку пра маладога Дастаеўскага і што яго вельмі любілі студэнты. Усё гэта так, але на Кальварыйскіх могілках перш-наперш лёг чалавек, які вярнуў у наш дзень старую беларускую п'есу і ў тандэме з рэжысэрам Андросікам паставіў самы папулярны беларускі спэктакаль сучаснасьці.

24 кастрычніка ізноў будзе ісьці «Камэдыя». Калі верыць сьвятарам, душа спадара Ўладзімера пасьпее пачуць сьмех у залі. Дзеля гэтага варта было жыць.

**Зьміцер Бартосік**

дыскаграфія

# «НЯ ПЛАЧ, МАЛАДЗІЦА»

Анжэла МАКАРАВА
(р) «Ковчег», 1999.

Зьмест аўтарскай касэты салісткі ансамблю народнай музыкі і песьні «Сьвята» Анжэлы Макаравай склалі творы мастацкага кіраўніка таго ж ансамблю кампазытара Леаніда Захлеўнага. Да іх дадалася адна сапраўды народная песьня «Із-пад каменя», якую спн. Макарава сьпявае ўжо ў ценю знакамітай Сьвятланы Суседчык. Ня плач, маладзіца! А спадзявайся на тое, што з часам, магчыма, вы й памяняецеся месцамі.

Праўда, альбом даказвае, што падобны абмен ролямі гэтым сьпявачкам пакуль што не пагражае. І хоць увесь альбом вытрыманы ў атмасфэры гэткай эстрадна-народнай стылістыкі, ён, здаецца, ня вытрымаў іспытаў ні там, ні там. Яго нельга назваць яскравым здабыткам у народнай музыцы, бо, апрача народнай манеры выкананьня песень Анжэлай Макаравай ды некаторых асабліваськяў аранжаваньня, нішто больш на народнасьць не паказвае. Да таго ж — адсутнасьць сапраўды яскравых, арыгінальных мэлёдыяў (апрача, бадай, загалоўнай песьні). Альбом нельга аднесьці і да здабыткаў жанру эстраднага, бо, каб зрабіцца эстрадай, тыя песьні неабходна было б выконваць з налётам лёгкай пошласьці, як тое робіць, напрыклад, «Лімітаваны балаган» з Расеі, і патрэбныя тыя ж мэлёдыі.

Ня плач, маладзіца! Ня варта забіваць галаву пытаньнямі тэорыі! Ёсьць што сьпяваць, дык сьпявай! Уласная аўдыторыя заўсёды адшукаецца. А што касэта такой менавіта атрымалася — бяз выдумкі, арыгінальнасьці, цалкам звычайнай і таму амаль ніякай, дык гэта ж, трэба разумець, не бяда нашага музычнага шоў-бізнэсу. Хоць сёй-той часам і сьцьвярджае, што яго ў Беларусі няма, як і масла, гарэлкі ды бэнзыну. Няпраўда. Ёсьць у нас усё! А калі нехта недзе тое й кажа, дык — хлусіць.

Галоўнае што? Каб дзеўкі сьлёзаў ня лілі.

А што гэты альбом прэтэндаваць сёлета на «ГРЭМІ» ня будзе...

**Заплаканы Слухач**



Памерла Наталі Сарот — французская пісьменьніца. Нарадзілася ў Расеі, у Іванаве, у 1902 годзе. Была адвакатам, але з 39 гадоў прысьвяціла сябе літаратуры. У «НН» друкаваліся яе «Трапізмы».

# Як гартавалася сталь

Што б ні казалі пра раман Мікалая Астроўскага «Як гартавалася сталь» мадэрныя літаратуразнаўцы, ён да сёньня застаецца адной з найулюбёных кніг у Кітаі. Пра гэта сьведчаць 300 перавыданьняў агульным накладам каля 13 млн. асобнікаў — згадзіцеся, лічба немалая нават для Кітаю. А ў наступным годзе кітайцы (і ўсё астатняе «прагрэсіўнае чалавецтва») будуць, нарэшце, мець магчымасьць пабачыць Паўку Карчагіна і Тоню на экранах сваіх тэлевізараў: нядаўна на студыі імя Даўжэнкі (Кіеў) скончылі працу над сумесным украінска-кітайскім 20-сэрыйным тэлефільмам з аднайменнай назвай. Кіраваў здымкамі вядомы кітайскі кінарэжысэр Кан Ган, а ролі выконвалі ўкраінскія акторы (пераважна з Тэатру драмы і камэдыі на Левым беразе). Фільм амаль гатовы да выхаду ў тыраж — засталося, па вялікім рахунку, толькі зрабіць мантаж і прадубляваць ролі кітайскай мовай.

«Новая экранізацыя твору, якім захаплялася пакаленьне, што вырасла разам з новым Кітаем, дапаможа яшчэ раз згадаць гісторыю сваёй краіны, яшчэ раз убачыць тагачасную моладзь, да апошняе мяжы адданую сваёй мары, сваёй веры, сваім ідэалам», — адзначыў пад час урачыстасьці, арганізаванай кітайскім пасольствам у Кіеве, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР Чжоў Сяо Пэй.

Прэм'ера кінастужкі, прымеркаваная да 50-х угодкаў утварэньня КНР, чакаецца ў лютым наступнага году на першым канале цэнтральнага тэлебачаньня Кітаю. Трэба думаць, гледачоў чакае грандыёзнае відовішча: бюджэт фільму склаў 1,2 млн. даляраў.

**Андрэй Скурко**

# КРЫНІЧКА

Сяргей ШЫДЛОЎСКІ

Гадоў дзесяць таму ў прыдзьвінскім парку Наваполацку закрынічыла глейкая строма. Цьвердзь аплывала рудымі патокамі да ракі. З каналаў, блізкіх да пэнсійных колаў, пра падзею сталася вядома ўсім заклапочаным экалёгіяй навапалачанам. То бок алергікам, уладальнікам гастрыту і бяссоньня. Ля крыніцы пачалі зьбірацца чэргі аматараў нехляраванай аквы — ліхтарыкі бліскалі да глухой начы. Зрэшты, «глухая ноч» — анахранізм. Кіслотнае неба Наваполацку па-над галовамі людзей са слоікамі расквечвалася агнямі нафтахімічных заводаў.

Але нішто не псавала гумору крынічнай чаргі. Гэтая нечуваная дасюль супольнасьць люзей у пузырыстых трыко дыхала волкім рачным паветрам, а выдыхала «Водар мяты». Чарга хутка расла і паглынула б неўзабаве ўсіх алергікаў гораду, каб не маразы.

Улада скрыпела, але цярпела, пакуль не разразілася заключэньнем санстанцыі. Маўляў, вада ўтрымлівае нітраты. Смакавала яна сапраўды сярэдне, і на чайніку заставалася іржа. Але фармалісты-мікрабіёлягі не ўлічылі, што навапалачане (самі ж хімікі!) яе абясшкоджвалі, карыстаючыся тэлеэфірамі Алана Чумака.

Недзе праз год, калі мода на крыніцу мінула, я ізноў завітаў на Дзьвіну. Было пахмурна, і зьнелюдзелае ўрэчча выдавала на вераемную ілюстрацыю Н.Орды да «Сабакі Баскервіляў». Пагатоў, вакол сьцежкі было поўна тузікавых экскрэмэнтаў.

Ля крыніцы нехта завіхаўся. Гэта была кабета гадоў шасьцідзесяці. Трыкатажны гарнітур зь люрэксам сьведчыў, магчыма, аб ейнай прыналежнасьці да сфэры адукацыі або мэдыцыны. Але валасы, рассыпаныя лядашчымі кудламі па старэчых плячах, пляжылі гэты стэрэатып. Толькі ў кашмарах першаклясьніка сустракаюцца пэдагогі з падобнымі «прычамі». Яна кленчыла перад крыніцай, стоячы каленьмі на цыраце. Ейныя паклоны крынічнаму струмяню выглядалі на адлюдзьдзі надзвычай дзіка.

Мо таксама дзякуючы нейкаму кашмару ўсё гэта я нібыта ўжо бачыў раней. Жах — пачуцьцё камічнае. Але калі ўзьнікае дылема — пабегчы альбо засьмяяцца, гумар пакідае нават самых сьмяшлівых.

Паны Баршчэўскі і Завальня гэтую вусьціш ацанілі б, каб забыліся на Вальтэра і Русо. То бок — калі б падыхалі сьпірытуальнай атмасфэрай 80-х гадоў *нашага* стагодзьдзя. Душы праваслаўных атэістаў — лёгкая здабыча для культуртрэгераў тагабочнага сьвету. Гадаванцы партшколаў блыталіся, каго запускаць на ўлазінах першым — ката́ альбо папа, а газэты з «цудатворнымі выявамі Турынскай плашчаніцы» разыходзіліся ў 80-х, як кумач на Першамай. Зрэшты, «дах ехаў» у адзінак, большасьць жа нованавернутых унікала эксцэсаў мэтафізыкі.

Крыніца шапацела, шапацелі паперы. Раптам мне здрадзілі ногі, «белвэсты» сьлізганулі, і жанчына палахліва ўсхапілася і борзда пабегла, адрэзаўшы гэтым магчымыя пытаньні. А я застаўся стаяць у балоце.

Гісторыя крынічнай чаргі між тым мела працяг. У 1990 годзе на выбарах у Вярхоўны Савет ва ўсіх акругах перамаглі кандыдаты, падтрыманыя БНФ. Наваполацкі БНФ канца 80-х рэпрэзэнтаваў сябе як экалягічны рух і зьбіраў шматтысячныя мітынгі, апэлюючы да праблемаў навакольнага асяродзьдзя — забруджваньня паветра, радыяцыйнай бясьпекі, будаўніцтва Даўгаўпілскай ГЭС. Тактыка была выбрана ўдала. Цяжка сказаць, наколькі досьвед наваполацкіх «крынічных чэргаў» прыдатны для чэргаў гарэлачных у цяперашнім Менску. ■

невялікае пра вялікіх

Адам ГЛЁБУС

## Букоўскі

Амэрыканец з Лос-Анджэлесу Чарлз Букоўскі адным зь першых зразумеў, што літаратуру чытаюць літаратары. Таму ягоны галоўны герой — сам Букоўскі, які любіць выпіць і памаркітавацца. А хто зь літаратараў ня любіць каўтнуць і заглыбіцца?

## Лярошфуко

Мараліст Франсуа Лярошфуко запэўніваў: «Ніякае прытворства ня зможа доўга хаваць каханьне, калі яно ёсьць, або ўдаваць — калі яго няма». Правільна. Таму п'есы пра каханьне ідуць у тэатры ня больш за тры гадзіны.

## Плятон

Невядомы мне Морт Сал занатаваў досыць слушнае назіраньне: «У саракавыя гады, каб скарыць жанчыну, трэ было быць салдатам: у пяцідзясятыя — габрэем (амэрыканскім — *А.Г.*); у шасьцідзясятыя — чарнаскурым (амэрыканскім — *А.Г.*). Цяперака, каб скарыць дзяўчыну, трэба быць дзяўчынкаю». Слушнае назіраньне. Толькі час плыве. Цяпер, у дзевяностыя гады, каб скарыць дзяўчыну, трэба быць хлопчыкам, які любіць выключна хлопчыкаў і чытае Плятона.

## Камю

Француз Альбэр Камю сьцьвярджаў: каханьне — гатовасьць старыцца адно з адным. Мяркую, гатовасьць у дадзеным выпадку ўжо ў мінулым. Каханьне — старэньне ў суседніх ложках, пад час глыбокіх сноў.

## Камю

Зьмест экзыстэнцыйнага раману «Чужаніца» Альбэра Камю можна ўкласьці ў адзін экспрэсіўны сказ... Не кажы, чорт, што сонца напякло мне ў галаву, у галаву, чорт, у галаву, чорт-чорт-чорт...

## Дарвін

Бацька тэорыі эвалюцыйнага разьвіцьця прыроды — сівабароды Чарлз Дарвін — найвялікшы з творцаў. Ён вярнуў чалавека на ягонае месца, у сьвет жывёлаў і расьлінаў, да трысьнягу, які спрабуе мысьліць.

## Дантэ

Каб Дантэ Алег'еры наведаў Лёнданскі ці які Маскоўскі мэтрапалітэн у «гадзіну пік», ягоныя ўяўленьні пра пекла моцна зьмяніліся б. І па якімнебудзь з дванаццаці пякельных колаў пачалі б лётаць перапоўненыя цягнікі, дзе людзі б душылі й тапталі адзін аднаго. А каб Дантэ наведаўся ў андэграўнд Санкт-Пяцярбургу, пекла магло б быць і гнілое, і халоднае, такое, што ад аднаго глытку сьцюдзёнага паветра заходзілася б сэрца.

некамэрцыйны праект ЗАТ "Сотвар"

**КНІЖКІ, КАСЭТЫ — ПОШТАЙ**

**Васіль Рагуля.** Успаміны — 39 тыс.р.
**Вячка Целеш.** Гарады Беларусі на старых паштоўках — 1100 тыс.р.
**Андрэ Дэні.** Гісторыя эканамічнай думкі. — 107 тыс.р.
**Новы запавет. Псалтыр** — 455 тыс.р.
**Францішак Кушаль.** Спробы стварэньня беларускага войска — 620 тыс.р.
**Кастусь Каліноўскі.** (З сэрыі "Беларускі кнігазбор") — 650 тыс.р.
**Мікола Чарняўскі.** Хто пакрыўдзіў кракадзіла (вершы, казкі, прымаўлянкі, лічылкі) — 397 тыс.р.

і яшчэ 48 кніжак, а таксама відэакасэты з мультфільмамі для дзяцей і аўдыёкасэты для маленькіх можна атрымаць, пералічыўшы грошы звычайным паштовым пераказам на рахунак ЗАТ «Сотвар» №3012000000195 у філіі 506 ААБ "Беларусбанк", код 809. У графе "Для пісьмовага паведамленьня" напішыце, якую касету або кніжку Вы замаўляеце.
Пры пералічэньні грошай просьба не даплочваць 20 тыс.р. да агульнага кошту замоўленых тавараў (іх Вы заплоціце пры атрыманьні кніжак на пошце).
Наш адрас: 220005, г.Мінск-5, а/с 13, тэл. 228-45-88, факс 228 45 87. Ёсьць поўны каталёг прапановаў.

страчаны скарб-3

# МЕНСК — ТОЛЬКІ ЭТАП

Уладзімер Жылка

## СЛОВА

Спачатку было слова. Дакладней — страчанае слова. Я сустрэў яго ў старым вершы і прыняў за апіску. У сучаснай мове гэткага слова няма. А старыя слоўнікі цьвердзяць, што яно было, толькі забытае, страчанае. За словам пачыналася аповесьць, літаратурны твор, таксама згублены, як выглядала, назаўсёды. А была тая аповесьць пра горад, апеты ў беларускіх песьнях і вершах, але гэтаксама страчаны і забыты. Па-над горадам стаяла зорка — наша прыцягальная мроя пра сваю зямлю і пра свабоду. І зорка таксама была забытая.

Са слова, прынятага мною за памылку, пачыналася клясычная нізка «Вершаў аб Вільні» Ўладзімера Жылкі:

*Калі сябры нас гудзяць згубаю*
*І ворагі прарочаць скон, —*
*Тады к Табе, о Вільня любая,*
*Прыводзяць згадкі у палон.*

У першых двух радках апазыцыі «сябры — ворагі» на самым відным месцы вытыркаўся незразумелы дзеяслоў *гудзяць*. Менавіта яго я прыняў за апіску пры першым прачытаньні. Пазьней давялося пабачыць і першую публікацыю ў віленскім даваенным часопісе «Студэнцкая думка», і пазьнейшыя — у леташнім выпуску «Беларускага кнігазбору». «Апіска» паўтаралася ў нязьменным выглядзе. Я спрабаваў прыдумаць, што іншае магло быць на месцы незразумелага слова і не знаходзіў прыймальнага заменьніка. Інтрыга ўзмацнялася тым, што наўпроставы паэтычны нашчадак Максіма Багдановіча Ўладзімер Жылка з найвялікшым чуцьцём і пietэтам ставіўся ня тое што да кожнага слова, але да кожнага гуку. І потым «Вершы аб Вільні» мусілі стаць хрэстаматыйнымі, бо працягвалі паэтычную місію Багдановічавай «Пагоні»:

*Толькі ў сэрцы трывожным пачую*
*За краіну радзімую жах,*
*Успомню Вострую Браму сьвятую*
*І ваякаў на грозных канях.*

Таму цяжка было паверыць, што першы ж радок вандруе з кнігі ў кнігу з банальнай апіскай. І пытаньне пра незнаёмы дзеяслоў пры кожнай новай сустрэчы заставалася адкрытым.

Вырашыць яго канчаткова я наважыўся сёлета, патрапіўшы ў Прагу. Рэч у тым, што пісаліся «Вершы аб Вільні» менавіта ў чэскай сталіцы, дзе Жылка ў сярэдзіне дваццатых гадоў вучыўся ва ўнівэрсытэце. Можа, дзеяслоў пазычаны з чэскай мовы?

Жыў паэт у прадмесьці Прагі Радоціне. Там і сёньня стаіць дом, у якім былі напісаныя віленскія вершы. Захаваліся лісты Жылкі да тагачаснага патрыярха віленскае беларушчыны Антона Луцкевіча. Лісты з Радоціна распавядаюць пра акалічнасьці стварэньня «Вершаў аб Вільні». Аднак мае падозраньні пра тое, што дзеяслоў узяты з чэскае мовы, не апраўда-ліся. Пры шчыльнейшым вывучэньні стала зразумела, што гэта не памылка, не апіска і не запазычаньне. Гэта слова папросту забытае ў сучаснай беларускай мове.

Можна па-рознаму вымяраць наступствы русіфікацыі, закрыцьця беларускіх школаў, звужэньня сфэры беларускай мовы. Але пры ўсім пры тым мова застаецца — зафіксаваная, жывая ў пэўных асяродках і заўсёды гатовая заняць пачэснае месца ў грамадзтве. Фатальныя страты адбываюцца, калі выпадаюць словы, нібы тыя зубы, а ў выніку паступова разбураецца гармонія цэлага. На забыцьцё дзеяслова «гудзіць» беларусам спатрэбілася гадоў пяцьдзясят. Жылка адкрываў гэтым словам свае лёсавызначальныя вершы без усялякага ўнутранага ваганьня, а ўжо маё пакаленьне бачыла ў ім апіску. Як высьветлілася, страчана і забыта зусім арыгінальнае беларускае слова, якое ня мае сэнсавага эквіваленту. Гэта значыць, што яно не заменнае нічым. На маю думку, найбольш дакладна ў цяперашняй беларускай мове ягоны сэнс перадае зусім небеларускае слова: гудзіць — дыскрэдытаваць.

## ГОРАД

Важнасьць усяго сказанага будзе зразумелая, калі згадаць, што за страчаным словам стаіць нешта нашмат большае, чым толькі лексыкаграфічныя характарыстыкі. За ім стаіць верш Уладзімера Жылкі, за якім, у сваю чаргу, стаіць натхнёнае памкненьне да тае зоркі, што служыць арыенцірам у шляху нашага народа да свайго нацыянальнага адраджэньня. Каб растлумачыць сэнс гэтых высокіх словаў, я мушу спачатку ўзнавіць іншыя строфы гэтага верша Ўладзімера Жылкі:

*Калі сябры нас гудзяць згубаю*
*І ворагі прарочаць скон, —*
*Тады к Табе, о Вільня любая,*
*Прыводзяць згадкі ў палон.*

*Ў маіх лятунках ты — ўладарная*
*Панеш ты, харашыня:*
*Завулкаў сон і ціш кляштарная,*
*Вільлі празрыстай глыбіня*

*Вялікай вуліцы экзотыка,*
*Тэатры, кіно, шпіталі:*
*І маліцьвенна ўзносіць готыка*
*Да неба тонкія шпілі;*
*. . .*
*А там, па-над мурамі даўнымі,*
*Дзе места ўсенькае відно,*
*Руіна думамі дзяржаўнымі*
*Гадае нам: чыё яно?*

Нагадаю, што гэты верш Уладзімер Жылка напісаў у прадмесьці Прагі і адразу адаслаў яго ў Вільню свайму літаратурнаму патрону Антону Луцкевічу. З лістоў да Луцкевіча вядома таксама, што ў Радоціне Жылка пісаў і «Аповесьць аб Вільні», якая, на жаль, не захавалася.

Атрымаўшы паэтаў ліст, Луцкевіч піша артыкул «Вільня ў беларускай літаратуры», куды ў выглядзе цытатаў устаўляе поўныя тэксты Жылкавых вершаў. Артукул друкуецца ў часопісе «Студэнцкая думка» і трапляе ў Прагу. У адказ, у лісьце Луцкевічу Жылка піша:

«Галоўнае, што радуе ў Вашым артыкуле, гэта тое, што мы адзінакава гледзімо на Вільню. Ваша аўтарытэтнае слова яшчэ болей пераконвае мяне, што к вырашэньню «Віленскага пытаньня» прыйдзем толькі нашым шляхам. І яшчэ — веру: зьдзейсьненьне сапраўднае сувэрэннасьці нашага народа, сапраўднае незалежнасьці адбудзецца толькі ў Вільні, ці... нідзе. Менск — этап у разьвіцьці і поступе нашае ідэі».

На двары 1925 год. Жылка піша гэта ў прадмесьці Прагі, у двухпавярховым асабняку, дзе здымае ці то пакой, ці то толькі ложак. У Вільні пануюць палякі і пальшчызна, але працуюць беларуская гімназія, газэты, партыі. Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада налічвае 100 тысяч сяброў. Вільня мае неафіцыйны статус сталіцы Заходняй Беларусі. У Менску будуюць камунізм. Жылка запыняецца над лістом Луцкевічу і выводзіць гэтую відавочна вынашаную, прадуманую і прачутую фразу: «Менск — толькі этап».

На маю думку, такое разуменьне вельмі сугучнае сёньняшняму дню. У Менску блытаюцца віды на будучыню Беларусі, дакладней, ніхто не прапануе выразнага бачаньня — якой павінна быць краіна. Зь сёньняшняга Менску не відаць тае прыцягальнае зоркі, якая б вабіла ў ідэальную Беларусь. Такое адчуваньне, быццам неглыбокая ручаіна нацыянальнае энэргіі вычарпаная тут дарэшты. Справа ў патэнцыяле. Уявіце, што сталіцаю Беларусі стаў бы ня Менск, а, скажам, Бешанковічы. Я, вядома, крыху утрырую, але раблю гэта для таго, каб паказаць, што па-першае, не ў геаграфічным цэнтры справа, па-другое, ня кожны горад можа выконваць функцыі духоўнай сталіцы, а калі й можа, дык патрэбна невядома колькі часу, каб горад набрыняў тым духам і нарадзіў уласную традыцыю. Факт той, што Менску XX стагодзьдзя на такую справу не хапіла. Ягонае ўнутранае энэргіі зусім няшмат, каб наталіць зацыкленае на Менску нацыянальнае адраджэньне. Затое ў Вільні адчуваецца гэткі патэнцыял.

Гаворачы пра Вільню, я ня маю на ўвазе тэрытарыяльных прэтэнзіяў да сучаснае Літвы або якой-кольвек экспансіі. Але тут важны прынцып.

Кажуць, сёньняшнюю Літву зрабілі паўнавартаснай нацыяй 20 гадоў даваеннага капіталізму. Але нельга забываць, што ўсе тыя 20 гадоў уся нацыя літаральна мроіла Вільню, як старажытную сталіцу, безь якой нікуды. І менавіта гэтая мроя найперш вырабіла літоўцаў у паўнавартасны народ. У выніку сёньня ў літоўскім Сэйме сур'ёзна гавораць пра тое, што Літва хоча браць чынны ўдзел у міжнародных рамовах пра будучыню Калінінграда, бо скончыўся 50-гадовы тэрмін, на які, паводле Пацдамскай канфэрэнцыі, гэтую тэрыторыю атрымала Расея. А нядаўна Літва ў сваіх афіцыйных паперах цалкам афіцыйна перайшла да называньня ўсіх гэтых Савецкаў ды Чарняхоўскаў і самога Калінінграду старымі літоўскімі назвамі. А ў нас нават дасьведчаная прафэсура называе Вільню Вільнюсам.

Параўнаньне зь Менскам як этапам выкліканае зусім рознымі патэнцыяламі двух гарадоў і розным нацыянальным досьведам і скарбам у іх. Наколькі празрыста адчуваў гэта Максім Багдановіч, калі пісаў сваю «Пагоню», Антон Луцкевіч у шматлікіх артыкулах, Уладзімер Жылка ў сваіх «Вершах аб Вільні», і наколькі гэта цяжка даказаць і зразумець сёньня. Быццам нешта зьмянілася за мінулыя гады. Хоць асабіста я схіляюся да думкі, што тут хаваецца адна з прычынаў нашага нацыянальнага застою. Менск можа заставацца палітычнай сталіцай, але ў справах духоўнасьці і культуры, гэта значыць, у справах ідэальных ён — толькі этап.

**Сяргей Паўлоўскі**

# Гу́дзіць

Сяргей ШУПА

***Тое, што слова гу́дзіць ужыў у сваім вершы Ўладзімер Жылка, ані не зьбянтэжыла складальнікаў савецкіх слоўнікаў: гэтага слова няма ня толькі ў стандартных беларуска-расейскіх слоўніках ці ў 6-тамовым тлумачальным, але нават у этымалягічным слоўніку беларускай мовы, які звычайна фіксуе розныя рэгіяналізмы і архаізмы. Адзіны прытулак гэтаму слову сёньня — дыялектныя слоўнікі.***

***Слова гу́дзіць жыве, або прынамсі зусім нядаўна жыло, на ўсім беларускім моўным абшары. Фіксуецца яно і ў расейскіх дыялектных слоўніках, а ўва ўкраінскай мове захавалася ў межах літаратурнага стандарту. Яно й ня дзіва — слова гу́дзіць ужывалася ў шматлікіх старажытных крыніцах, што ствараліся на ўсходнеславянскіх абшарах. У беларускіх крыніцах яно сустракаецца ў Аповесьці пра Валхвоў, у творах Сымона Буднага, у актавых кнігах Літоўскае Мэтрыкі.***

***Гу́дзіць некага — значыць абгаворваць, ганіць, асуджаць, чарніць, зьнеслаўляць, асабліва калі несправядліва і за сьпінаю, але таксама і ў вочы. Гу́дзяць звычайна бабы мужыкоў, сьвякроўкі нявестак, маткі дзетак, суседзі адзін аднаго. Гу́дзяць дзяўчыну — каб ня бралі, гу́дзяць тавар — каб зьбіць цану або пазбавіцца канкурэнта. Гу́дзяць нечую працу — каб выставіцца самому.***

***Гу́дзяць, пакуль не агу́дзяць, загу́дзяць, пагу́дзяць, або й згу́дзяць на нішто. Можна й ня моцна, а толькі трошку — прыгу́дзіць.***

***Адгу́дзіць некага — адраіць браць на працу або да шлюбу. Разгу́дзіць нешта — разладзіць нагаворамі.***

***Агуда — паклёп. Загуда — фатальная хіба.***

***У іншых мовах такога слова з такім значэньнем няма. Паходжаньне цьмянае, варыянтаў тлумачэньня шмат і ніводзін не гучыць пераканаўча. Ідэальная характарыстыка для пурыстычнага акту аджыўленьня. Можна вярнуць у актыўны ўжытак, чаго там баяцца — усё адно нехта згу́дзіць.*** ■



Фота Дзяніса Раманюка.

Вільня — беларускі Ерусалім. Від з даху дому, у якім знаходзіцца віленская рэдакцыя «НН»

# ПРАДУКТЫ

Аляксандар УРБАНОВІЧ

Фота IREX-ProMedia.

Аднойчы, гады два таму, мяне прывабіў тэкст на пачку пральнага парашку «Е». Там было напісана літаральна наступнае:

«E-Standart для замочваньня, ручнога і аўтаматычнага мыцьця. Унікальная формула пральнага парашку. Эфэктыўна спраўляецца з забруджваньнем. Цудоўны сродак для замочваньня, ручнога і машыннага мыцьця. Зьмяшчае адбельвальнікі, якія дапамагаюць зрабіць Вашу бялізну асьляпляльна белай.

E-Standart дапаможа падмываць плямы і бруд нават пры нізкай тэмпэратуры. Дзякуючы актыўнай сыстэме энзымаў, гэты пральны парашок хутка спраўляецца зь любымі плямамі ўжо пры замочваньні».

Перапрашаю за доўгае цытаваньне. Але ж гэта быў першы тэкст на беларускай мове, які я прачытаў на прадукце замежнага вытворцы, гэтым разам польскага прадпрыемства ангельскай фірмы Cussons. Акрамя працытаванага вышэй, там прыводзілася падрабязная інфармацыя пра спосаб ужываньня і карысныя парады — адным словам, усё тое, што было надрукавана й на іншых мовах.

Другога падобнага выпадку мне прыйшлося чакаць доўга. Нарэшце, чытаю на ўпакоўцы харчовых кубікаў Gallina Blanca:

«КУРЫНЫ БУЛЁН»

Вага нэта: 80 г

Спосаб ужываньня: распусьціць кубік у 0,5 л супу ці кіпню і кіпяціць на працягу 3 хвілін. Адзін булёнавы кубік надасьць водар вашым соўсам, супам, стравам зь мяса й гародніны. Захоўваць у сухім і халаднаватым месцы.

Гэты дэгідратаваны прадукт складаецца з наступных інгрэдыентаў: Соль. Узмацняльнік смакавых якасьцяў. Крух-

мал. Тлушч. Курынае мяса. Экстракт бялкоў з гародніны. Гародніна (цыбуля, пастарнак, морква, пятрушка). Спэцыі. Водары. Натуральная фарба» і г. д.

... Я веру, што калі-небудзь нават сьпіс прадуктаў замежных вытворцаў, якія прызначаныя для продажу ў нашай краіне ды адпаведна маюць назву або які большы тэкст на беларускай мове, будзе завялікі для цытаваньня. Можа, нават некалі будзе прыняты закон, які б забараняў прадаваць у Беларусі тавары замежнай вытворчасьці, якія ня маюць надпісу на беларускай мове. Але варта запомніць, якія вытворцы былі першымі. Гэта фірмы Cussons Polska S.A., Польшча і Preparados Alimenticios, S.A., Гішпанія.

Я б агітаваў купляць па адпаведных пазыцыях прадукцыю толькі гэтых вытворцаў. Але ж у гэтым, бадай, няма патрэбы. Гішпанская фірма зьяўляецца фактычным манапалістам у сваім сэктары, а «Е» намнога пераўзыходзіць іншыя пральныя парашкі ў крытэрыі «эфэктыўнасьць/кошт». Аднак ці можа хто дапоўніць такі сьпіс фірмаў-вытворцаў ці іхных прадуктаў ужо сёньня?

***

Трапіў мне неяк рэклямны кружок піва Becker Bier. Невялікая такая кардонка, на пярэднім баку па цэнтры назва прадукту ды каляровая назва фірмовай эмблемы, а наўкруг надпіс на нямецкай мове: Gebraut nach dem deutschen Reiheits-gebot von 1516. Гэта значыць, зварана ў адпаведнасьці з германскай пастановай аб чысьціні (прадукту) ад 1516 году.

Тыя часы ёсьць знакавымі і для нас, беларусаў. Толькі годам пазьней Скарына выдрукаваў сваю першую кнігу. Былі ў нас тады і пісаныя законы. Мы часта й справядліва ганарымся нашымі Статутамі ад гадоў 1529, 1566, 1588. Але ж Статуты гэтыя, як і іншыя дакумэнты тых часоў, дасюль знаходзяцца ва ўжытку пераважна толькі вузкага кола нацыянальна сьвядомых гуманітарыяў. Няма, так бы мовіць, выхаду на рэаліі сёньняшняга жыцьця. Хай бы калі хто з парлямэнтароў падняўся ды сказаў, што той ці іншы закон патрэбна адрэдагаваць так і так, бо гэта больш адпавядала б нормам, прынятым у Статуце 1588 году. Ці які вытворца спаслаўся на прадпісаньні да якасьці прадукту, якія дзейнічалі ў далёкія часы.

***

Прачытаў у «Народнай волі» апісаньне таго, якім чынам арганізаванае жыцьцё ў Амэрыцы (№ 172 за гэты год). Дык там у апошні чацьвер лістападу сьвяткуецца «Дзень удзячнасьці», у які амэрыканцы дзякуюць карэнным жыхарам кантынэнту, індзейцам, за тое, што тыя выратавалі жыцьцё першым каляністам. Тыя іх некалі навучылі вырошчваць кукурузу, зьбіраць журавіны ды паляваць вялікіх індзейскіх курэй, дык цяпер уся Амэрыка есьць на гэтае сьвята смажаную індычыну з журавінавай падлівай ды кукурузу.

Ну, а ў цэлым, як жывецца на сьвеце карэнным індзейцам, якіх акупавала дзяржава, якая працяглы час была найбагацейшай у сьвеце? Ці ведаем мы прозьвішча хаця аднаго індзейца, які праславіў бы свой народ перад цэлым сьветам, як нашыя Скарына ці Вольга Корбут? На памяць прыходзіць толькі адно прозьвішча: Гойка Міціч. Калі хто з-за сваёй маладосьці ня ведае, дык гэта такі югаслаўскі актор, які згуляў шмат роляў у гэдээраўскіх фільмах пра індзейцаў. І — усё. Цывілізацыя неяк абыходзіцца без унёску індзейцаў у сучасны працэс ейнага развою. Беларусаў пакуль ведаюць. Але ж ці не такую будучыню імкнуцца прыгатаваць для нас нашыя інтэграсьцікі?

...Вельмі мілая атрымоўваецца карціна. Расейскія каляністы выбіраюць адзін са змрочных дзён пры канцы восені ды заводзяць традыцыю наядацца ў гэты дзень дранікамі ў знак падзякі за тое, што землі іхнай правінцыі, якую яны дзеля зручнасьці даўно ўжо назвалі Лякатарнай, некалі падаравалі ім прадстаўнікі асобнай нацыі людзей — беларусаў... Аднак нават у такую «прызнацельнасьць» верыцца слаба. Бо што будзе вялікай Расеі да тых, хто некалі жыў на адным адсотку ейнай тэрыторыі? ■

Наша Ніва 90 гадоў таму

## Рады для гаспадароў

**Як садзіць фруктовыя дрэвы**

На пасадку *трэба выбіраць шчэпы здаровыя*, бяз ран на пні і галінах; пень павінен быць просты, гладкі, бліскучы, чысты — *бяз моху; каранёў* хоць і ня шмат, але тоўстых, а ня тонкіх і густых, як шчотка. З гатункаў лепей усяго ў нас удаюцца яблыні Антонаўскія і Шэранькія, грушы Сапяжанкі.

Ямы для шчэпаў трэба *выкапаць* загадзя, не пазьней, як за два тыдні да пасадкі; ямы глыбінёй павінны быць 3/4 аршыны і шырынёй ня менш аршыну.

Капаючы ямы, верхні гнойны слой зямлі (глебу) трэба класьці на адзін бок, а ніжні пусты слой (падглебьбе) на другі, дзеля таго што гнойную зямлю трэ будзе класьці ў ніз пад самае карэньне, а пустым толькі запоўніць яму зьверху.

Перш чым пасадзіць шчэп, трэба добра агледзець карэньне, ці дзе не пакалечанае, то трэба абрэзаць калекі вострым нажом на здаровае месца і толькі тады ўжо садзіць.

Гальлё на яблынях і грушах, задзічыны, абразаць ня трэба, а на сьліўках, вішнях і чарэшнях кожную галіну скараціць на трэцюю частку.

*Садзіць трэба так:* узяць просты кіёк і палажыць яго наверх ямы на самай сярэдзіне, пасьля, узяўшы шчэп, дзяржаць яго на сярэдзіне так, каб ашыйк быў на два вяршкі вышэй кійка, паложанага празь яму; месца, дзе канчаецца стваліна, а пачынаецца карэньне, называецца ашыйкам, колер ашыйку такі самы, як і карэньня — жаўтаваты. Ашыйк павінен быць пад зямлёй, а то дрэўца будзе хварэць і, само сабой, ня будзе даваць карысьці. У той час, калі адзін дзяржыць дрэўца, другі распраўляе карэньне так, каб канцы ляжалі свабодна і не захіляліся кверху. Калі ўжо яма запоўнена, трэба прытаптаць, і зноў крыху падсыпаць зямлі, і разгарнуць яе каля пня ніжэй, па берагах вышэй.

Можна памеж маладых груш і яблынь садзіць сьліўкі і вішні, бо іх век карацейшы, і калі падымуцца і расшыряцца яблыні і грушы, то тады можна выкінуць сьліўкі.

*Лемеш.*

## прыватныя абвесткі

**Гурток «Сноп»** (саломапляценьнс) запрашас на заняткі (панядзслак 10.00—12.00, пятніца 15.00—18.00. Мснск, вул.Кірава, 14, Нацыянальны цэнтар творчасьці, аўд.308, Валя Лойка

**Віншую Кацю Корзун** з БГЛ з Днём народзінаў! Жадаю бясхмарнага нсба і зьдзяйсьнсньня ўсіх пачынаньняў. Кастусь Зьмітрысвіч

**Віншую Валянціну Цырэндылыкаўну** зь Днём нараджэньня! Зычым здароўя, шчасьця, выкананьня ўсіх мараў. Родныя й блізкія

**Набуду паштоўкі** альбо рэпрадукцыі карцін С.Далі (нядорага). Т.: 251-19-52

**Набуду збор твораў** У.Караткевіча. Т.: 283-61-87, Андрэй

**С.Адамовічу!** Займайся ты голымі бабамі і ня сунься ў палітыку. Цыцкі і палітыка — рэчы нссумяшчальныя

**Кнігі па гісторыі** Бсларусі набуду. Т.: 214-85-82

**Пазнаёмлюся** зь бсларусам, які жывс ў Эўропс і марыць стварыць сапраўдную бсларускую сям'ю. 211400, Полацак-12, а/я 39

**Калі ты Беларус(ка),** то ў цябс 26 кастрычніка сьвята — Дзснь народзінаў Алсся Г. з Баранавічаў. Многа піва — за тваё здароўс, Алссь! Сябры

**Дзень народзінаў** Алсся (Грыцаўца), Бсларуса, цудоўнага хлопца

**Масква сусьвету** вушы прашумсла Пра самавызначэньнс аж да зор. Смалснск дзс? Нэвсль? Гомсль дзс падзсла? Стварыла Гомсльскі гансбны калідор. Нсвядомы. 29 всрасьня 1926 г.

**Лістуйце ўсе,** нсзалсжна ад полу і узросту, хто лічыць сябс БЕЛАРУСАМ. Адкажу на ўсс лісты. Салігорск, 223710, Багамолава 24, кв.209

**Віншую ўкраінскіх** футбалістаў з працягам барацьбы за псрамогу ў чэмпіянацс Эўропы. А.Шаўчэнка — лспшы.

**Зычу сваёй матулі** здароўя і натхнсньня ва ўсіх справах. Божа, бсражы ўсіх бсларускіх матуль.

**Шукаю сапраўдных** прыхільнікаў сапраўднага бсларускага року. Жывс Бсларусь! Жывс бсларускі рок! 231300, Ліда, Рыбіноўскага 28, кв.28

**Шукаю зьвесткі пра Паганства,** буду всльмі ўдзячны ўсім, хто дашлс лісты. 231300, Ліда, Рыбіноўскага 28, кв.28

**Прапануем в/а працу** ў хаце (250 у.а.). Дасгупна ўсім! Укладзіцс 2 капэрты (адзін са зв/а)+ купон б/а: 220089, Мснск-89, а/я 122

**7 лістапада** — Сьвята яднаньня ўсіх здаровых сілаў Айчыны. За цэлую Літву! Літва, бацькаўшчына мая, Ты як здароўс...

**7 лістапада** — Сьвята яднаньня ўсіх здаровых сілаў Айчыны. За ЦЭЛУЮ ЛІТВУ!

**Калі ты** бсларускі нацыяналіст — змагайся разам з намі! ЗАМ «Агмснь», 220024, а/с 264

**Куплю гістарычны слоўнік** бсларускай мовы, тамы 1—14, 16. Т. 247-09-52. Андрэй

ТАТАЧКА, ВІНШУЮ. ЛЕПШАЙ ЗА ТВАЮ КАЛЫХАНКУ НЯМА Ў СЬВЕЦЕ!

*БУСЬЛІК-БАГУСЬЛІК*

ВІТАЛЬКУ ЦЫГАНКОВУ! ВІНШУЮ, РОДНЕНЬКІ! ДАЙ БОЖА СІЛАЎ І ЗДАРОЎЯ ТАБЕ, НАТХНЕНЬНЯ Ў ТВОРЧАСЬЦІ І ВОЛЬНАГА ПАВЕТРА. МОЙ МУЖ І КАХАНАК, СЯБРА І АБАРОНЦА, Я КАХАЮ ЦЯБЕ!

*ТВАЁ АЛЕНЯНЯ*

ТАА"СОКТАС" першы пастаўшчык у Беларусі

СОДЫ КАЛЬЦЫЯНАВАНАЙ

Тэл.: (017) 210 42 19, Тэл./Факс: (017) 229 22 93

НАША НІВА КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220050, Менск, а/с 537

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

«Наша Ніва» незалежная газэта, заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Галоўны рэдактар Сяргей Дубавец. Рэдактар выпуску Андрэй Дынько. Мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі. Адказны сакратар Аляксандра Макавік. Дызайн-макет Лявон Раманчык. Набор Насты Дзядзенкі. Выдавец: рэдакцыя газэты «Наша Ніва». Заснавальнік Павал Жук. Адрас для допісаў: 220050, Менск, а/с 537. Tel/fax: (017) 227-78-92. E-mail: niva@user.unibel.by Http://members.xoom.com/Nasa_Niva.

© НАША НІВА. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. Наклад 3050. 6 палос фарматам А2. Нумар падпісаны ў друк 3:21, 25.10.1999. Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 5460. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам па друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г.Менск, пр.газэты «Известия», д. 8, кв. 173.